Сямейная газета



Першыя запіскі ад матуль



Мадэль, якой можна салодкае



Каханне, што збівае з ног
СТАР. 16

Родная газета на роднай мове

ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

22 ЛЮТАГА 2018 г. ЧАЦВЕР № 37 (28653)

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

# ЛІСНЯНСКІЯ РЫБАЛОВЫ



**У вёсцы Лісна, што знаходзіцца на беразе аднайменнага возера ў Верхнядзвінскім раёне, зімовай рыбалкай захапляюцца не толькі мужчыны. Адна з паспяховых аматарак гэтай справы — Святлана ГЕРАСІМЧЫК. Часта Святлану на возеры бачаць не адну — на яе каленях грэецца ў чаканні ўлову хітрая котка-ласуха — сапраўдны гурман свежай рыбы.**

**Святлана Васілеўна ў недалёкім мінулым — сталічны муляр-атынкоўшчык, брыгадзір найлепшага калектыву будаўнікоў па капрамонце дамоў. Дзесяць гадоў таму Святлана змяніла прапіску гарадскога жыхара на вясковае жыццё і ніколі пра гэта не пашкадавала.**

**Анатоль КЛЯШЧУК, фота аўтара.**

## ЦЫТАТА ДНЯ



**Юрый БОНДАР, міністр культуры:**

*«У пытанні выкарыстання турыстычнага патэнцыялу гістарычных культурных месцаў у нас ёсць нямала прабелаў. І тут варта арыентавацца на суседзяў з Еўропы, дзе культурны турызм — істотны артыкул даходаў і крыніца развіцця культурнага патэнцыялу краіны. З Міністэрствам спорту і турызму ўжо вяліся перамовы па праграме сумесных дзеянняў. Летась Мінкультуры накіравала прапанову аб уключэнні ў Дзяржаўны кадастр турыстычных рэсурсаў 13 значных аб'ектаў, размешчаных у раёнах, у тым ліку філіял «Мікалаеўшчына» літаратурна-мемарыяльнага музея Якуба Коласа, які аб'ядноўвае чатыры сядзібы: Смольня, Акінчыцы, Альбуць і Ласток у Стаўбцоўскім раёне. Плануецца таксама сканцэнтравацца на стварэнні кластараў. Смела можна гаварыць пра ўсё большую цікавасць да культурнай спадчыны. Недапрацоўкі з лагістыкай і транспартным забеспячэннем, якія ёсць, і іншыя пытанні будуць абмяркоўвацца з профільным міністэрствам і мясцовымі органамі».*

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | -3° |
| Віцебск | - 9° |
| Гомель | - 3° |
| Гродна | -5° |
| Магілёў | - 8° |
| Мінск | - 7° |

ISSN 1990 - 763X

■ Нерухомасць

# ГОД СКЛАДАНЫ, АЛЕ ДЫНАМІЧНЫ

Пры продажы дзяржуласнасці прапануецца даць магчымасць адначасова ўдзельнічаць у аўкцыёнах усім ахвотным, у тым ліку і грамадзянам



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

**Дзяржаўны камітэт па маёмасці курыруе ўсе віды маёмасных і зямельных адносін, геадэзіі і картаграфіі, рэгістрацыю і тэхінвентарызацыю нерухомай маёмасці. Аднак нарматыўна-прававая база з цягам часу патрабуе карэкціроўкі. Аб асобных заканадаўчых праектах, асноўных выніках работы ў мінулым годзе і планах на 2018-ы расказаў старшыня Дзяржаўнага камітэта па маёмасці Андрэй ГАЕЎ.**

СТАР. 4

■ Прыярытэты

# КАЛЕКЦЫЯ САРТОЎ

### Як беларускія вучоныя ствараюць харчовую бяспеку краіны

**Калі тэатр пачынаецца з вешалкі, то харчовая бяспека краіны — з лабараторыі, дзе вучоныя, селекцыянеры працуюць над вывядзеннем новых сартоў і гібрыдаў культур. Іх работа ціхая, непрыкметная, штодзённая. Але яе вынікі мы бачым на нашых палетках, паліцах крам. Ва ўмовах нашага клімату пачалі вырошчваць калісьці экзатычныя для Беларусі кавуны, вінаград, дыні, грэцкія арэхі. Ад забяспечанасці якасным айчынным пасяўным матэрыялам залежыць ураджай, дабрабыт кожнай сям'і. Аб тых зменах, што адбыліся ў раслінаводстве, земляробстве, распрацоўках беларускіх вучоных, карэспандэнту «Звязды» расказаў дырэктар Навукова-практычнага цэнтра Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі па земляробстве Фёдар ПРЫВАЛАЎ.**

— Прынцыпова важна тое, што ў Беларусі захавалі селекцыю і насенневодства. У гэтай галіне страцілі многія краіны былога Саюза. Цяпер яны вымушаны закупляць матэрыял за мяжой, у тым ліку і ў нас, — кажа Фёдар Прывалаў. — Супрацоўнікі Цэнтра праводзяць селекцыю 42 культур, колькасць зарэгістраваных сартоў дасягнула 365. Усе яны даюць высокую ўраджайнасць: зерневыя больш як 100, рапс — 50, зернебабовыя — да 60 цэнтнераў з гектара. Прычым яны паспяхова канкурыруюць з найлепшымі ўзорамі замежнай селекцыі. Айчынныя сарты адаптаваны да тутэйшых умоў. Яны ўстойлівыя да розных прыродных катаклізмаў, маразоў, да хвароб, многіх шкоднікаў. Штогод павялічваецца доля пасяўных плошчаў беларускіх сельгаскультур. У 2015 годзе яна перавысіла 80 %, а па азімым жыцце, рапсе і лубіне айчынныя сарты займаюць да 95 % пасеваў.

Як адзначыў Фёдар Прывалаў, культуры беларускай селекцыі атрымліваюць усё большае распаўсюджанне і за мяжой. Больш як 2 млн гектараў займаюць там сарты збожжавых, лубіну, шматгадовых траў, кармавых буракоў.

СТАР. 2

# АПОРА ДЛЯ ААН

**Не самае прыемнае адчуванне, калі над табой відавочна дамінуе адна і тая ж асоба. Ці краіна. На сучасным этапе такую аднапалярную мадэль свету ўявіць складана. З цягам часу стала фарміравацца такое светаўпарадкаванне, як шматпалярнасць, — некалькі моцных цэнтраў, якія суіснуюць, але не перашкаджаюць развівацца адзін аднаму. Праўда, да гэтага планета пакуль толькі рухаецца. Аб гэтым, а таксама аб праблемах, з якімі сутыкаецца сучаснасць, Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка казаў падчас сустрэчы з першым намеснікам Генеральнага сакратара Арганізацыі Аб'яднаных Нацый Амінай Махамед.**

Кіраўнік дзяржавы пабяцаў, што Беларусь будзе надзейнай апорай для ААН не толькі таму, што Прэзідэнт з павагай ставіцца да яе Генсакратара Антоніу Гутэрэша, і не толькі таму, што Арганізацыя — гэта тая пляцоўка, дзе можна адкрыта, шчыра казаць пра існуючыя праблемы. «Але яшчэ і таму, што вы, мы ўсе нацэлены на ліквідацыю нераўнамернага развіцця, на ліквідацыю беднасці, на стварэнне сапраўднага шматпалярнага свету», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. Беларускі лідар выказаў надзею, што калі-небудзь існуючы сёння шматпалярны свет будзе прадстаўлены не трымапяццю дзяржавамі, а ўсімі краінамі, і тады ў поўным сэнсе кожны чалавек на планеце будзе мець права быць у яго цэнтры. І менавіта Еўропа мусіць адыграць значную ролю ў вырашэнні праблем сучаснасці.

Наша краіна зрабіла нямала і каб заслужыць такую высокую сустрэчу, і каб даказаць прыхільнасць да Мэт устойлівага развіцця. «Мы цвёрда адданыя гэтай ідэі, як і вы, таму што ўпэўнены ў тым, што прычынай усіх непарадкаў, у тым ліку самай вялікай праблемы — тэрарызму, з'яўляецца менавіта нераўнамернае развіццё дзяржаў, што парадже перш за ўсё беднасць. Мы прытрымліваемся той формулы, што дай чалавеку працу — ён ніколі не возьме ў рукі зброю», — падкрэсліў Аляксандр Лукашэнка. Ён вітаў правядзенне ў Мінску Рэгіянальнага форуму нацыянальных каардынатараў па Мэтах устойлівага развіцця. Гэта, па яго словах, дасць магчымасць абмеркаваць асноўны напрамак дзейнасці краін ААН на найбліжэйшую перспектыву — пытанні выканання парадку дня ў галіне ўстойлівага развіцця на перыяд да 2030 года.

Аміна Махамед падкрэсліла: «Ваша лідарства цяпер запатрабавана як ніколі. Лідарства і той голас за шматпалярнасць, за шматбаковае вырашэнне праблемных пытанняў, якія падымае Беларусь на міжнароднай арэне». Яна сказала, што ў сучасным свеце вельмі многа канфліктаў і яны разнастайныя — у залежнасці ад таго рэгіёна, дзе яны адбываюцца. Менавіта таму катэгарычна не хапае талерантнага стаўлення да самых розных сітуацый і праяўленняў, лічыць яна.

* * *

Рэгіянальны форум каардынатараў па Мэтах устойлівага развіцця (МУР) працягваецца два працоўныя дні: 21—22 лютага. Напярэдадні першы намеснік Генеральнага сакратара ААН Аміна Махамед сустрэлася са старшынёй Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Беларусі Міхаілам Мясніковічам і яго намеснікам Мар'янай Шчоткінай, якая з'яўляецца нацыянальным каардынатарам па дасягненні МУР.

На сустрэчы Мар'яна Шчоткіна прапанавала стварыць глабальную базу даных парадавога вопыту дасягнення МУР. На сёння няма абагульненай інфармацыі, як розныя дзяржавы да іх рухаюцца. Беларускі бок плануе звярнуцца да Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН падчас форуму, каб яна ўзяла на сябе гэту працу. Дарэчы, міжнародныя арганізацыі праявілі цікавасць да гэтага мерапрыемства. У Мінск прыехалі выканаўчы сакратар Еўрапейскай эканамічнай камісіі ААН Вольга Алгаерава, прадстаўнікі ЮНІДА, ФАА, Сусветнага банка, Еўразійскай эканамічнай камісіі, ЕБРР, а таксама агенцтваў сістэмы ААН і Еўрапейскага саюза.

На Рэгіянальным форуме нацыянальных каардынатараў па дасягненні МУР Мар'яна Шчоткіна адзначыла асноўныя прыярытэты развіцця Беларусі — інвестыцыі, занятасць, экспарт, інфарматызацыя, моладзь і ў цэлым павышэнне якасці і ўзроўню жыцця насельніцтва. І гэта супадае з мэтамі Парадку дня — 2030.

Міністр замежных спраў Беларусі Уладзімір Макей адзначыў, што пытанні ўстойлівага развіцця маюць безумоўную каштоўнасць самі па сабе, але іх найважнейшае прызначэнне — садзейнічаць стабільнасці і ўмацаванню эканамічнага і палітычнага супрацоўніцтва паміж дзяржавамі. Рэгіянальны форум па МУР адкрывае шэраг дыскусій, прысвечаных стабільнасці і бяспецы ў рэгіёне. Так, Уладзімір Макей паведаміў, што ў маі беларускі бок правядзе вялікую канферэнцыю па пытаннях бяспекі ва Усходняй Еўропе. Гэты дыялог будзе працягнуты на сустрэчы асноўнай групы Мюнхенскай канферэнцыі ў Мінску восенню. Таксама ў кастрычніку ў сталіцы пройдзе канферэнцыя па пытаннях контртэрарыстычнай тэматыкі пад эгідай АБСЕ.

**Вераніка ПУСТАВІТ, Надзея АНІСОВІЧ.**

# ПАРАДАК ПАВІНЕН БЫЦЬ ВА ЎСІМ

**Цэны на паслугі па зімовых відах спорту ў сталіцы будуць перагледжаны. Аб гэтым заявіла кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта Наталля КАЧАНАВА падчас сустрэчы з калектывам УП «Белкаапзнешгандаль Белкаапсаюза».**

«Гэта не работа, калі зімой паслугі па катанні на лыжах або каньках каштуюць немалыя сумы. Абмяркуем, паглядзім, з чаго фарміруецца гэтая цана. Пытанне абмяркуем з кіраўніком Мінска. Людзі павінны быць інфармаваныя, дзе можна бясплатна пакатацца на лыжах, на каньках», — адзначыла Наталля Качанава, адказваючы на пытанне супрацоўніцы прадпрыемства.

Расказала кіраўнік Адміністрацыі Прэзідэнта і пра асноўныя напрамкі дзяржаўнай палітыкі — заробак, будаўніцтва жылля, ахову здароўя, дэмаграфічную бяспеку, паведамляе БЕЛТА. Асаблівая ўвага ў Год малой радзімы — на парадак у краіне. «Словы «малая радзіма» мы кажам з асаблівай цеплынёй у душы. Гэта месца, дзе чалавек нарадзіўся, жыў і вырас, прайшоў сваё станаўленне. На 2018 год для ўсіх нас дакладна вызначаны задачы. Мы павінны навесці ідэальны парадак у нашай краіне. Павінны быць фасады прыгожыя, тэрыторыі прыбраныя. Пастаўлены шэраг іншых задач, у тым ліку па здачы аб'ектаў незавершанага будаўніцтва, у тым ліку ў Мінску. На працягу 2018 года мы павінны зрабіць нашу краіну яшчэ больш прыгожай і добраўпарадкаванай, усё залежыць ад нас», — сказала Наталля Качанава.

# КАЛЕКЦЫЯ САРТОЎ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)*

Не сакрэт, што яшчэ не так даўно беларусы збіралі ўсяго па 200 цэнтнераў цукровых буракоў з гектара, цяпер жа іх ураджайнасць павялічылася больш як удвая — да 500 цэнтнераў на круг. Раней перапрацоўвалі 2 млн тон караняплодаў, сёння — ужо 5 млн тон. Цукровая прамысловасць выпускае 800 тыс. тон цукру штогод, у тым ліку 300 тыс. тон ідзе на ўнутранае спажыванне, астатняе — на экспарт. Гэты прадукт закупляюць у тым ліку Расія і Украіна.

Сярод найбольш значных распрацовак цэнтра — забеспячэнасць краіны пшаніцай для хлебапякарнай вытворчасці, піваварным ячменем, арганізацыя ўласнай вытворчасці насення кукурузы, рапсу, трыцікале. Прычым распрацоўку навуковых асноў селекцыі гэтых сельскагаспадарчых культур ажыццявілі ў Беларусі ўпершыню. Стварэнне сартоў пшаніцы, якія можна выкарыстоўваць для выпечкі хлебабулачнай прадукцыі, вырабу макароны, — сапраўднае дасягненне айчынных вучоных. І хоць скептыкі сцвярджалі, што вырасціць для гэтых мэт зерне ва ўмовах беларускага клімату немагчыма, супрацоўнікі цэнтра даказалі адваротнае і ў выніку селекцыі стварылі сарты азімай і яравой пшаніцы адмысловай якасці. Гэта дазволіла павялічыць іх вытворчасць і значна зменшыць імпарт мукі і вырабаў з яе.



Сховішча банка генетычных рэсурсаў.

— За 2006—2016 гады ў Дзяржаўны рэестр Беларусі ўключаны 31 сорт і гібрыд крыжакветных культур, 12 сартоў увайшлі ў Дзяржаўны рэестр Расійскай Федэрацыі, — кажа Фёдар Прывалаў. — У 2016-м у краіне 90 % плошчаў займалі сарты селекцыі цэнтра. Гэта дазволіла забяспечыць унутраныя патрэбы ў тэхнічным масле — біядызелі і харчовым алеі. Выведзены таксама 11 сартоў лёну-даўгунца і 4 сарты алейнага лёну. У параўнанні з вядомымі сусветнымі аналагамі яны вылучаюцца большай пластычнасцю і стабільнасцю рэалізацыі генетычнага матэрыялу.

На рахунку вучоных і стварэнне гібрыдаў кукурузы. Цяпер больш за 50 % плошчаў прыходзіцца на іх долю. Да нядаўняга часу ў Беларусі існавала праблема з вытворчасцю травяных кармоў. У апошнія гады іх назапашванне для грамадскага статка павялічылася на траціну, у асноўным за кошт «каралевы палёў», на долю якой прыпадае 46 % агульнага аб'ёму нарыхтоўкі. Прычым больш за палову плошчаў засяваецца беларускім зернем. Прамысловая вытворчасць яго ў нашай краіне пачалася ў 2004 годзе з уводам у дзеянне Мазырскага кукурузнага калібровачнага завода.

Цэнтрам распрацаваная праграма развіцця селекцыі і насенняводства. У яе межах у рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Шыпяны-АСК» Смалявіцкага раёна пабудаваны і працуе першы ў краіне насеннеачышчальны завод. Ён прадугледжвае цалкам закончаны цыкл: прыёмку зерня, пярвічную ачыстку, сушку, прамежкавае захоўванне насеннага матэрыялу, сартаванне, пратручванне, інкрустацыю і складаванне. Магутнасць прадпрыемства да 8 тыс. тон насення штогод. Сутачная прадукцыйнасць — 110—130 тон.

У цэнтры створаны банк генетычных рэсурсаў. «Гэтае месца — святая святых, пачатак харчовай бяспекі нашай краіны, дзе захоўваецца 53 калекцыі, якія налічваюць больш за 33 тыс. узораў сельскагаспадарчых культур, культур прыроднай флоры, раслін, якія занесены ў Чырвоную кнігу, — адзначае загадчыца лабараторыі Ірына Матыс. — Некаторыя калекцыі збожжавых, зернебабовых, крупяных, кармавых, алейных культур, лёну, цукровых буракоў аб'яўлены нацыянальным набыткам.

Гэты збор дае магчымасць выводзіць сарты і вырошчваць культуры павышанай устойлівасці да прыродных умоў краіны. Калекцыйныя ўзоры змяшчаюцца на кароткатэрміновае, сярэднетэрміновае і працяглае захаванне — да 40 гадоў. Кожны пад індывідуальным нумарам у адпаведнасці з міжнароднымі патрабаваннямі. Праз дзесяць гадоў упакоўку адкрываюць і правяраюць насенне на вільготнасць, усходжасць. Калі яно страціла свае ўласцівасці, то замяняюць новым матэрыялам. З насення, якое тут захоўваецца, можна ўзнавіць любую культуру, што расце ў Беларусі.

Самую багатую ў свеце калекцыю культурных раслін з 250 тыс. узораў сабраў расійскі вучоны-батанік Мікалай Вавілаў са сваёй камандай з 1923 па 1941 год. Яна і стала першым сярод краін банкам генаў.

Пасля развалу Савецкага Саюза рэспублікі, якія ў яго ўваходзілі, у тым ліку і Беларусь, засталіся без генафонду. І толькі дзякуючы кіраўніку краіны ў нас з'явілася такая ўнікальная структура. У свеце налічваецца практычна 2 тыс. банкаў генных рэсурсаў. Цэнтр супрацоўнічае з самымі буйнымі з іх, вядзе абмен матэрыялам з Кітаем, Балгарыяй, Польшчай, Германіяй, Расіяй ды іншымі.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

## ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

### НАТА НЕ ЛІЧЫЦЬ, ШТО РАСІЯ ПАГРАЖАЕ КАМУ-НЕБУДЗЬ З ЯЕ КРАІН-ЧЛЕНАЎ

**Пра гэта заявіў у апублікаваным учора інтэрв'ю часопісу Foreign Policy генеральны сакратар альянсу Енс Столтэнберг.**

«Мы не бачым якой-небудзь пагрозы (з боку Расійскай Федэрацыі) у дачыненні да якога-небудзь члена альянсу, — сказаў ён, адказваючы на пытанне, як будзе дзейнічаць блок, «калі Расія паўторыць у Балтыі тое, што распачала ва Украіне». — Я заўсёды асцярожна падыходжу да гіпатэтычных сітуацый. Але я магу сказаць, што калі адбудзецца нешта падобнае да таго, што здарылася ў Крыме і ва Украіне, то гэта, вядома, выкліча меры ў адказ з боку ўсяго альянсу, таму што НАТА заклікана абараняць усіх сваіх членаў ад пагроз».

Па словах Столтэнберга, НАТА накіравала баявыя падраздзяленні ў гэтую частку Еўропы. «Іх прысутнасць там заклікана не справакаваць канфлікт, а прадухіліць яго», — сцвярджае ён.

### СЕНАТ БРАЗІЛІІ ЎХВАЛІЎ УКАЗ АБ ПЕРАДАЧЫ АРМІІ КАНТРОЛЮ НАД БЯСПЕКАЙ У РЫА-ДЭ-ЖАНЭЙРА

**Федэральны сенат (верхняя палата парламента) Бразіліі ўхваліў у ноч на сераду прэзідэнцкі ўказ аб перадачы арміі кантролю за бяспекай у штаце Рыа-дэ-Жанейра.**



Прадугледжаныя ўказам меры будуць дзейнічаць да 31 снежня гэтага года.

Яшчэ 16 лютага прэзідэнт Бразіліі Мішэль Тэмер падпісаў указ аб перадачы арміі кантролю над сіламі правапарадку штата Рыа-дэ-Жанэйра на фоне ўсплёску гвалту, выкліканага супрацьстаяннем паміж мясцовымі бандамі наркагандляроў. Падобная надзвычайная мера была прынятая ўладамі паўднёваамерыканскай краіны ўпершыню пасля звяржэння ваеннай дыктатуры ў сярэдзіне 1980-х гадоў. Адказным за аперацыю быў прызначаны генерал Уолтэр Соўза Брага, які займаўся забеспячэннем парадку падчас XXXI летніх Алімпійскіх гульняў у Рыа-дэ-Жанэйра ў 2016 годзе.

### СМІ: ЛІЗАВЕТА II АРАНДАВАЛА ЎЧАСТАК У ЦЭНТРЫ КІЕВА

**Каралева Вялікабрытаніі Лізавета II арандавала ў цэнтры Кіева зямельны ўчастак плошчай 1,6 тысячы квадратных метраў. Пра гэта гаворыцца ў рашэнні гарадскога савета Кіева, размешчаным на сайце kievvlast.com.ua.**

«Яе Каралеўскай Вялікасці і кіраўніцы Злучанага Каралеўства перадаецца ў арэнду на 49 гадоў зямельны ўчастак плошчай 0,1622 гектара на вуліцы Касцельнай, 13а, у Шаўчэнкаўскім раёне горада Кіева ў сувязі з набыццём права ўласнасці на нерухомую маёмасць», — гаворыцца ў рашэнні савета.

Паведамляецца, што штомесячная плата за арэнду складзе 568 тысяч грыўняў. Прадстаўнікам каралевы трэба будзе на працягу месяца перадаць неабходныя дакументы мясцовай адміністрацыі.

Раней паведамлялася, што Лізавета II арандавала па гэтым адрасе офіс плошчай 2,2 тысячы квадратных метраў.

■ Незабыўнае

# СУСТРАКАЕ ВЁСКА-ПОМНІК

**23 лютага адбудзецца традыцыйны агітпрабег «Мінск — Хатынь — Дальва»**

**Нягледзячы на тое, што лагойскай вёскі Дальва ўжо даўно не існуе на геаграфічнай карце Беларусі, на месцы былога населенага пункта, што за пяць кіламетраў ад шашы Мінск — Віцебск, мінімум двойчы на год бывае шматлюдна.**

Каб ушанаваць памяць мірных жыхароў, якія загінулі ад рук нямецка-фашысцкіх захопнікаў усяго за некалькі дзён да вызвалення сталіцы — 19 чэрвеня 1944 года, сюды едуць усе ад малога да вялікага. Да мемарыяльнага комплексу, што з'явіўся сярод лесу ў ліпені 1973-га, пры падтрымцы Лагойскага райвыканкама, мемарыяльнага комплексу «Хатынь», Нацыянальнай дзяржаўнай тэлерадыёкампаніі, а сёлета і Беларускага фонду міру, ужо 44-ы год запар імчаць і напярэдадні Дня абаронцаў Айчыны і Узброеных Сіл нашай краіны.

Калі зіма бясснежная, то з павароту на былую вёску, у асноўным моладзь, трапляе бягом. Сёлета, як гэта бывае часцей, спаборнічаць у хуткасці школьнікі і вайскоўцы Лагойшчыны, а таксама студэнты некаторых сярэдніх і вышэйшых навучальных устаноў сталіцы плануюць на лыжах.

Але галоўная місія традыцыйнага агітпрабегу «Мінск — Хатынь — Дальва» — усё ж у тым, каб яшчэ раз сказаць, што памяць аб тых бязвінна пакараных 44 жыхарах (29 дзецях і 15 дарослых) апошняй спаленай гітлераўцамі падчас Другой сусветнай вайны разам з людзьмі вёскі жыве. І наўрад ці мы сёння ведалі б пра Дальву, каб не Мікалай Гірыловіч, тады падлетак, якому адзінаму пашчасціла не трапіць у тое вогнішча. Але разам з усёй вёскай, домам, суседзямі ў попел ператварыліся яго бацькі і трое братоў...

Справай усяго жыцця для Мікалая Гірыловіча стала захаванне памяці аб сваіх блізкіх і аднавяскоўцах. Пры падтрымцы нямногіх неабыякавых, а ў асноўным дзякуючы ўласным намаганням, амаль праз 30 гадоў пасля трагедыі на месцы спаленай вёскі з'явіўся мемарыяльны комплекс «Дальва». «Многія падышлі да пенсіі з лецішчамі, машынамі, а мы з вёскай-помнікам», — кажа ўдава Мікалая Гірыловіча Рыма Ігараўна.

**Вераніка КАНЮТА**

■ Транспарт

# КРУЦІЦЕ ПЕДАЛІ!

### Да 2030 года долю веласіпедных паездак у сталіцы плануюць павялічыць у восем разоў

**Пастаянная камісія па гарантаванні бяспекі дарожнага руху пры Савеце Міністраў прыняла Канцэпцыю развіцця веласіпеднага руху ў Беларусі. Згодна з ёй, доля выкарыстання двухколавага транспарту да 2030 года істотна ўзрасце.**

Так, у гарадах з колькасцю насельніцтва 50 тысяч чалавек і больш долю выкарыстання веласіпедаў у аб'ёме ўсіх перамяшчэнняў плануюць павялічыць да 8—10 %, у гарадах, дзе жыве менш за 50 тысяч чалавек, і пасёлках гарадскога тыпу — да 15—20 %, у аграгарадках і сельскіх населеных пунктах — звыш 40 %.

Доля выкарыстання гэтага транспарту ў сталіцы ўжо перавысіла адзін працэнт.

— Заяўленыя 8—10 % для Мінска — даволі шмат. Гэта каля 500—700 тысяч паездак у дзень на розных мэтах у цёплы час года, — каментуе **старшыня праўлення Мінскага веласіпеднага таварыства Павел ГАРБУНОЎ.** — Але гэта цалкам дасягальна. Напрыклад, у Варшаве бягучая доля паездак складае 4 %, у Берліне — 13—15 %. У агульнаеўрапейскай стратэгіі, якая цяпер абмяркоўваецца, хутчэй за ўсё, будзе індыкатар — 12 % паездак да 2030 года ў сярэднім па гарадах Еўрасаюза. Таму нашы мэты цалкам своечасовыя.

Работа па рэалізацыі канцэпцыі ўжо ідзе. Міністэрства архітэктуры і будаўніцтва распрацоўвае веласіпедны стандарт. Да 28 лютага аблвыканкамы павінны прадумаць свае планы па практычным увасабленні канцэпцыі.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ**

**ОАО «Шершуны-Агро» Минского района на постоянную работу требуются:**

- Оператор по искусственному осеменению животных
- Зоотехник
- Начальник молочно-товарного комплекса

Требования: опыт работы.
Жилье предоставляется

Телефон для справок
8044-578-17-11

УНП 690654548

**Уважаемые акционеры ОАО «Завод «Белпласт» 27 марта 2018 года в 14.00 состоится очередное общее собрание акционеров по адресу: г. Минск, ул. Гусовского 2, ОАО «Завод «Белпласт»**

**Повестка дня собрания**

1. Отчет директора об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2017 год и основных направлениях развития Общества на 2018 год.
2. Отчет наблюдательного совета о проделанной работе в 2017 году.
3. Отчет ревизионной комиссии о результатах ревизии финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2017 год.
4. Утверждение годового отчета и баланса Общества за 2017 год. О результатах аудита финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2017 году.
5. Установление суммы безвозмездной спонсорской помощи на 2018 год.
6. О путях развития производства, в том числе проведения реконструкции (модернизации). О мерах, направленных на снижение издержек и повышение эффективности производства.
7. Об избрании членов наблюдательного совета на 2018 год кумулятивным голосованием.
8. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Утверждение размера вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
10. О внесении изменений в устав Общества, предусматривающих избрание членов наблюдательного совета Общества только кумулятивным голосованием.

Регистрация участников собрания проводится в день собрания в приемной ОАО «Завод «Белпласт» (2-й этаж) с 13.00 до 14.00.

Акционерам необходимо иметь при себе документ, удостоверяющий личность.

Представителю акционера – доверенность и документ, удостоверяющий личность.

С информацией о деятельности Общества за отчетный период можно ознакомиться с 6 марта 2018 года с 13.00 до 15.00, а с иной информацией, подлежащей предоставлению при подготовке к проведению собрания, с 20 марта 2018 года по 27 марта 2018 года с 14.00 по 16.00 по адресу: г. Минск, ул. Гусовского, 2 в приемной ОАО «Завод «Белпласт», по месту проведения собрания: 27 марта 2018 года.

Наблюдательный совет ОАО «Завод «Белпласт».

УНП 100008342

■ Здарэнне

# Свойскі сабака траўміраваў дзіця

**Навіна пра тое, што ў Наваполацку свойскі сабака пароды далмацінец пакусаў галаву васьмімесячнага дзіцяці, літаральна шакіравала.**



19 лютага аб адзінаццатай гадзіне раніцы ў кватэры бабулі, куды мама з хлопчыкам прыехалі ў госці, і адбылося гэта надзвычайнае здарэнне. Дарослыя — бабуля дзіцяці і яго мама — у гэты час былі на кухні непадалёку.

У Наваполацкай цэнтральнай гарадской бальніцы, куды прывезлі маленькага пацыента, дыягнаставалі адкрытую чэрапна-мазгавую траўму. Потым хлопчыка перавезлі ў Віцебскую абласную клінічную бальніцу. Як паведамілі ў гэтай медыцынскай установе, пасля аперацыі яго жыццю нічога не пагражае, але стан дзіцяці стабільна цяжкі.

Ва ўпраўленні Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Віцебскай вобласці паведамілі, што прызначана судова-медыцынская экспертыза. Падчас яе будуць вывучаныя ўсе медыцынскія дакументы і дадзена экспертная ацэнка нанесеных сабакам пашкоджанняў па ступені цяжару.

Ці можна лічыць гэты сумны інцыдэнт унікальным? Што канстатуюць эксперты?

— Асобнай статыстыкі адносна колькасці праведзеных экспертных даследаванняў, звязаных з укусамі жывёл, ва ўпраўленні Дзяржаўнага камітэта судовых экспертыз па Віцебскай вобласці не вядзецца. Аднак у апошнім выпуску навукова-практычнага часопіса «Судовая экспертыза Беларусі» быў праведзены аналіз архіўных заключэнняў судова-медыцынскіх экспертыз, выкананых ва ўпраўленні па горадзе Мінску ў 2014—2016 гадах. Ад укусаў сабак у названы перыяд пацярпела 59 чалавек. Прычым у адным выпадку наступіў лятальны канец, — паведаміла **Ганна БАРЫШНІКАВА, афіцыйны прадстаўнік упраўлення.**

Сабака, як канстатавалі ў Следчым камітэце, афіцыйна зарэгістраваны ў кватэры гаспадыні. Усе неабходныя прышчэпкі яму зроблены. Суседзі ахарактарызавалі гаспадыню станоўча.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■ Алімпіяда-2018

# Гульні наведае больш за мільён балельшчыкаў

### Пра гэта на прэс-канферэнцыі паведаміў прадстаўнік аргкамітэта Гульняў Сон Пэк Ю

**Найбольшай папулярнасцю ў аматараў спорту на Алімпіядзе карыстаюцца шорт-трэк, фігурнае катанне і канькабежны спорт.**

У аўторак дырэктар па менеджменце службы тэлевяшчання Алімпійскіх гульняў Ціма Люмэ паведаміў, што Алімпіяду ў Пхёнчхане паглядзяць кожны трэці жыхар Зямлі. «У суме ў нас будзе больш за мільён балельшчыкаў па выніках Гульняў», — адзначае прадстаўнік аргкамітэта.

Дырэктар па камунікацыях Міжнароднага алімпійскага камітэта Майк Адамс дадаў, што 90 % даходаў ад продажу білетаў і сувенірнай прадукцыі Алімпіяды МАК плануе накіраваць на развіццё спорту.

## Біятланісткі выйдуць на апошні старт

**Сёння ў Пхёнчхане адбудзецца жаночая эстафета.**

Трэнерскі штаб зборнай Беларусі назваў імёны спартсменак, якія выступяць за нашу каманду. На першым этапе пабяжыць Надзея Скардзіна, эстафету ў яе прыме Ірына Крыўко. Трэцяй у камандзе адправіцца на дыстанцыю Дынара Алімбекава, а на заключным адрэзку выступіць лідар беларускай зборнай Дар'я Домрачава. Наша каманда атрымала 10-ы стартавы нумар, усяго ў эстафету заявіліся 18 каманд. Пачатак гонкі ў 14.15 па беларускім часе. Завершыцца біятлонная праграма мужчынскай эстафетай 23 лютага.

## Нямецкая каманда прывезла на Алімпіяду 3,5 тысячы літраў піва

Зборная Германіі прывезла на Алімпійскія гульні ў Пхёнчхан 3,5 тысячы літраў безалкагольнага піва, нямецкія спартсмены п'юць гэты напой пасля трэніровак у якасці ізатоніку (напой, які дапамагае арганізму аднаўляць водна-солевы баланс пасля працяглых нагрузак).

Па даных выдання The New York Times, безалкагольнае піва спецыяльна для спартсменаў зварыў бровар Krombacher. Урач лыжнай каманды зборнай Германіі Ёнас Шэр выявіў яшчэ ў 2009 годзе, што безалкагольнае піва памяншае імавернасць запалення і ўзнікнення інфекцый ў дыхальных шляхах спартсменаў.

Нагадаем, цяпер зборная Германіі ідзе на другім месцы ў неафіцыйным медальным заліку Гульняў-2018.

## Амерыканцы выступаюць з прахам родных

У выступленнях спартсменаў з ЗША на Алімпійскіх гульнях вымалёўваецца новая тэндэнцыя. Усё часцей атлеты карыстаюцца падтрымкай не толькі жывых сваякоў, але і тых, хто ўжо памёр. Справа не ў прысвячэнні ім сваіх перамог, а ў тым, што атлеты выступаюць на Гульнях з іх прахам.

Напрыклад, амерыканскі лыжны акрабат Джонатан Ліліс выступае з кулонам, у якім змяшчаецца прах ягонага памерлага брата. Пра гэта паведаміў бацька спартсмена Джэймі Ліліс. «Калі Джонатан гатовы здацца, ён чуе брата, які кажа: «Устань і зрабі гэта». Гэта вялікі матывіровачны фактар».

Другая амерыканская атлетка Ліндсі Вон — гарналыжніца, алімпійская чэмпіёнка 2010 года ў хуткасным спуску, уладальніца чатырох Кубкаў свету ў агульным заліку і двухразовая чэмпіёнка свету — таксама мае такі талісман.

«Я катаюся для дзядулі. Ён натхняў мяне ўсё жыццё, мне цяжка, што яго няма тут са мной. Я б хацела, каб бый. І хацела выйграць для яго. Чаму я паглядзела на неба пасля спуску? Дзядуля ж павінен быў дапамагаць мне. І я спытала: «Што здарылася, дзед? Чаму мы не выступілі лепш?»

## 116-га лыжніка сустракалі як чэмпіёна

У лыжнай гонцы на 15 км вольным стылем 43-гадовы мексіканец Херман Мадраса фінішаваў апошнім. Ён перасек рысу на 14 хвілін пазней за лыжніка з Пакістана, 12 хвілін прайграў бразільцу і мараканцу, адстаў нават ад эквадорца.

Нягледзячы на 116-е месца, Херман урачыста дакаціўся да фінішнай рысы са сцягам Мексікі і ўсміхаўся. Там яго сустракалі канкурэнты — калумбіец, партугалец, танганец і мараканец. Херман Мадраса стаў на лыжы толькі ў 2017 годзе. На гэта нечаканае захапленне яго натхніў часопісны тэкст пра перуанскага лыжніка Раберта Карселена, які фінішаваў на Алімпіядзе ў Сочы з пераломам рабра. Да гэтага Херман удзельнічаў у спаборніцтвах па трыатлоне Ironman — гэта заплыў на 3,86 км, заезд на веласіпедзе па шашы на 180 км і марафонскі забег. «Лыжны спорт — самы складаны, і гэта мяне ўразіла. Я захацеў пераадолець сябе, звязаўся з Карселенам і паехаў у Паўднёвую Амерыку», — расказваў мексіканец. Там ён аб'яднаўся са сцяганосцам Тонга Піта Таўфатофуа і чылійцам Хонатанам Фернандэсам. У снежні яны трэніраваліся ў Аўстрыі па 10 гадзін у дзень. «Мы разам каталіся, разам гатавалі, рупіліся адзін пра аднаго. Неверагодны вопыт», — адзначыў Мадраса.

**Дар'я ЛАБАЖЭВІЧ**



# ГОД СКЛАДАНЫ, АЛЕ ДЫНАМІЧНЫ

## Наша зямля ў лічбе

З набыццём беспілотнага лятальнага апарата камітэт завяршыў стварэнне трохузроўневай сістэмы атрымання лічбавай інфармацыі аб зямельных рэсурсах. «Цяпер сістэма складаецца з беларускага спадарожнікавага касмічнага апарата, аэрафотакамеры, якая ўстанаўліваецца на самалёт, і беспілотнага лятальнага апарата, з дапамогай якога ўдакладняюцца даныя», — сказаў Андрэй Гаеў.

Ён таксама падкрэсліў, што летась Дзяржкаммаёмасць упершыню выйшла на пяцігадовы цыкл абнаўлення лічбавай інфармацыі аб зямельных рэсурсах, выканаўшы значны аб'ём аэрафотаздымачных работ. У гэтым кірунку адзначана актыўнае ўзаемадзеянне з Міністэрствам лясной гаспадаркі. «У мінулым годзе больш за 9 тысяч паведамленняў былі перададзеныя ў розныя дзяржорганы, перш за ўсё ў выканкамы, па пытаннях, звязаных са зменамі зямельнага пакрыцця. Гэта і заняцце зямельных участкаў, зарастанне іх і іншае. Больш чым на 3,5 тысячы выпадкаў паступіла зваротная сувязь па прыняцці рашэнняў», — дадаў Андрэй Гаеў.

Працягваецца работа па ўдакладненні межаў раёнаў. «Першапачатковая яе выканалі па Мінскай вобласці, летась — па Гродзенскай і Брэсцкай. Цяпер рыхтуецца праект указа, каб надаць адпаведны юрыдычны статус праведзенай рабоце. На чарзе — удакладненне да межаў у Віцебскай, Гомельскай і Магілёўскай абласцях», — адзначыў старшыня Дзяржкаммаёмасці.

## Аўкцыён для ўсіх

«Праект змяненняў ва Указ «Аб парадку распараджэння дзяржаўнай маёмасцю» падрыхтаваны намі з улікам практыкі, што склалася пры прымяненні дзеючага акта, які дазваляе далучаць дзяржмаёмасць у абарот самымі рознымі спосабамі», — лічыць Андрэй Гаеў.

Сёння для продажу дзяржаўнай маёмасці, як правіла, праводзяцца аўкцыёны. Спачатку аб'ект выстаўляецца па стартавай, базавай цане, у яе аснову бярэцца ацэначны кошт альбо ў пэўных выпадках — рынкавы. Калі аб'ект не прадаецца, то цана зніжаецца на 20 %, затым на 50 % і на 80 % — аж да адной базавай велічыні. Як паказвае практыка, аб'ектаў з паніжэннем у 20 % прадаецца вельмі мала. Унесена прапанова аб тым, каб існавала магчымасць пачынаць аўкцыёны, зніжаючы цану адразу напалову. Калі аб'ект карыстаецца попытам, то рынак сам выраўнуе яго кошт.

Для таго каб грамадзянін мог купіць дзяржаўны аб'ект, спачатку трэба, каб былі праведзены таргі з удзелам толькі юрыдычных асоб і індывідуальных прадпрымальнікаў. Калі на першым аўкцыёне ніхто з юрыдычных асоб і ІП не выявіў жадання набыць аб'ект, то ў грамадзяніна з'яўляецца такая магчымасць для рэканструкцыі пад жылы дом або аграсядзібу. Зараз прапануецца адмовіцца ад гэтага парадку і даць магчымасць адначасова ўдзельнічаць у аўкцыёнах усім ахвотным, у тым ліку і грамадзянам.

Мноства аб'ектаў рэалізуецца за адну базавую велічыню, пры гэтым не ва ўсіх населеных пунктах можна вызначаць такую стартавую цану. Прапануецца дазволіць продаж аб'ектаў па стартавым кошце ў памеры адной базавай не толькі ў абласных цэнтрах, але і ў гарадах з колькасцю насельніцтва больш за 50 тысяч чалавек. Практыка паказвае, што калі на аб'ект ёсць некалькі прэтэндэнтаў, то канкурэнцыя прывядзе да большай выніковай сумы.


Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Каб павысіць зацікаўленасць уладальнікаў невыкарыстоўваемай маёмасці яе прадаць, закладваецца норма аб тым, што палова сродкаў, выручаных ад продажу, застаецца ў іх. (Сёння ж усе грошы за прададзеную дзяржмаёмасць накіроўваюцца ў бюджэт.) Акрамя таго, прапануецца павялічыць растэрміноўку пры куплі аб'ектаў дзяржуласнасці з аднаго года да трох гадоў, пры гэтым права на яе атрыманне будзе вызначаць пакупнік, а не прадавец.

## У спісе на інвестыцыі — 43 прадпрыемствы

Штогод сумесна з зацікаўленымі міністэрствамі Дзяржкаммаёмасць складае спіс аб'ектаў для прыватызацыі і прыходу інвестараў. У гэтым годзе падрыхтаваны абноўлены пералік з 43 акцыянерных таварыстваў і унітарных прадпрыемстваў, летась вызначана 34 такія прадпрыемствы. Некаторыя з іх перайшлі ў новы спіс.

Адказваючы на пытанне аб неабходнасці складання такіх спісаў, старшыня Дзяржкаммаёмасці падкрэсліў, што яны разглядаюцца міжнароднымі рэйтынгавымі агенцтвамі як наяўнасць фармальнай магчымасці прыватызаваць тое ці іншае прадпрыемства, набыць пакет акцый. «Гэтая работа неабходная. Прадстаўнікі замежнага бізнесу хочуць бачыць нешта рэальнае, яны не вельмі разумеюць выраз, калі прадаецца ўсё. Некаторыя лічаць, што калі прадаецца ўсё, значыць, не прадаецца нічога», — дадаў ён.

## Адзіны аператар і закладныя адносіны

Асобна кіраўнік камітэта спыніўся на ўцягванні ў гаспадарчы абарот маёмасці, якая не выкарыстоўваецца і неэфектыўна выкарыстоўваецца. Адна з прапанаваных мер для больш актыўнага выкарыстання маёмасці — стварэнне адзінага аператара па яе продажы.

«Каб не ствараць новых суб'ектаў, не мяняць заканадаўства, мы вызначыліся, што Інстытут нерухомасці і ацэнкі будзе выконваць шэраг функцый. Згаданая юрыдычная асоба будзе выконваць усю перадпродажную падрыхтоўку аб'ектаў, уключаючы, калі трэба, афармленне праваных дакументаў на нерухомасць, праводзіць аўкцыёны, — растлумачыў Андрэй Гаеў. — Гэта значыць увесь аб'ём задач, якія трэба вырашыць для ўключэння ў абарот, будзе вырашацца гэтай структурай».

Спачатку тэхналогію адпрацуюць на акцыянерных таварыствах. Калі эксперымент будзе паспяховы, то такі падыход распаўсюдзіцца і на дзяржмаёмасць, дадаў Андрэй Гаеў.

Змены ў Закон «Аб дзяржаўнай рэгістрацыі нерухомай маёмасці, правоў на яе і здзелак з ёй» уступаюць у сілу ў ліпені гэтага года. «Вырашаюцца неабходныя арганізацыйныя моманты, для таго каб спрасціць афармленне закладных адносін. З другога паўгоддзя юрыдычным асобам, якія заключаюць крэдытныя дагаворы пад заклад нерухомасці, будзе дадзена магчымасць не звяртацца ў агенцтва па дзяржаўнай рэгістрацыі, усё можа быць зроблена ў банку, які выдае крэдыт. Такім чынам, кліент вырашыць у комплексе ўсе свае пытанні, у тым ліку звязаныя з іпатэкай нерухомасці», — растлумачыў Андрэй Гаеў. Летась у нашай краіне было заключана больш за 52 тысячы дагавораў пад заклад нерухомасці, у тым ліку 26 тысяч — пад заклад кватэр. Пятая частка дагавораў па іпатэцы на кватэры заключана ў Мінску.

## Без біткойна. Пакуль...

Адказваючы на пытанні журналістаў, Андрэй Гаеў адзначыў, што аб набыцці за крыптавалюту аб'ектаў дзяржнерухомасці пакуль гаворка не ідзе. У той жа час Дзяржкаммаёмасць удзяляе вялікую ўвагу прымяненню інфармацыйных тэхналогій. І ў геадэзічнай дзейнасці, і ў картаграфіі ствараюцца сучасныя комплексы. «Пры складанні тапаграфічных картаў палову працэсаў аўтаматызавалі. Набыць, атрымаць іншымі спосабамі дзяржаўную нерухомасць можна на разнастайных умовах і падставах», — сказаў Андрэй Гаеў.

Сярод перспектыўных кірункаў у дзейнасці камітэта прымяненне тэхналогіі блокчэйн. «У гэтым кірунку плануем рухацца і ў бягучым годзе паспрабуем рэалізаваць работу з выкарыстаннем блокчэйна па папярэдняй рэгістрацыі дагавораў долевага ўдзелу ў будаўніцтве. Для гэтага і заканадаўчую аснову неабходна будзе стварыць. Пры гэтым уважліва вывучылі вопыт Азербайджана», — адзначыў старшыня Дзяржкаммаёмасці.

У рэжыме рэальнага часу вырашаецца пытанне з Міністэрствам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя па размяшчэнні ў лічбавым выглядзе інфармацыі аб асабліва ахоўных прыродных тэрыторыях і не толькі, адзначыў кіраўнік камітэта. Што датычыцца картаграфіі, то завяршаецца работа над апошнім, чацвёртым томам «Вялікага гістарычнага атласа Беларусі», які ў выглядзе картаў завершыць стварэнне цэласнай карціны развіцця нашай краіны — ад першабытнага часу да сучаснасці. Сёлета з чатырох тамоў плануецца зрабіць адзін зводны матэрыял, які зміншчае квінтэсэнцыю гэтай фундаментальнай навуковай працы.

**Сяргей КУРКАЧ.**

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

■ Беражыце сябе!

# Блакітныя і жоўтыя языччкі

### Карыстацца газам бывае смяротна небяспечна...

**Жудасная трагедыя здарылася днямі ў Гродне: шасцікласніца ўтапілася ў ванне, атруціўшыся чадным газам. Як мяркуе следства, яна ўключыла газавы водаграгравальнік у ванным пакоі і страціла прытомнасць, паколькі ў дымаходзе калонкі і вентыляцыйным канале была недастатковая цяга. Медыкі рэанімавалі вучаніцу і ў цяжкім стане прывезлі ў бальніцу, аднак выратаваць яе не ўдалося. У аўторак дзяўчынка памерла...**

**Праз няспраўнасць газавага абсталявання, а таксама спробы нагрэць газам памяшканне гіне значна больш людзей, чым можна ўявіць. Перш чым пакой нагрэецца да камфортнай тэмпературы, пры няспраўнай калонцы вы спаліце ўвесь кісларод у ім і незаўважна пачняце засынаць, пасля чаго ўжо не падымецеся, папярэджвае Віталь ХЛАПЯНЮК, газавік з 33-гадовым стажам працы.**

— Каб нагрэць газам памяшканне, трэба, каб халоднае паветра не заходзіла ў жыллё, інакш тэмпература не будзе падымацца. Так што людзі заканапачваюць, што называецца, усе дзіркі: зачыняюць наглуха вокны, яшчэ і шчыліну пад дзвярыма чым-небудзь прыкрыюць, — сведчыць спецыяліст. — Праўда, ніхто не думае, што для гарэння аднаго кубаметра прыроднага газу — метану — трэба 9 кубоў паветра. А каб спаліўся кубаметр звадкаванага газу — прапану — увогуле зрасходуецца 20—30 м³ паветра. Зразумела, што такім чынам з памяшкання выпальваецца ўвесь кісларод і людзі задыхаюцца. Прылягуць на канапу падрамацца ды там і застаюцца.

Асаблівá вераломная газавая цеплыня на дачных участках, дзе замест дома па першасці стаіць бытоўка ці вагончык, якія, здаецца, вельмі проста напаліць, уключыўшы пліту. А многія яшчэ ставяць на яе цагліны, каб тыя нагрэліся. Газ пасля выключаюць, а цэгла працягвае працаваць як печ, пакуль астывае і аддае цяпло. Калі перакрыць газ у час, яно, можа, і нічога, аднак хто ведае, дзе тая мяжа, калі нагрэтае газам паветра яшчэ смяротнае? Тым больш што ў самой пліце хаваецца яшчэ адна небяспека.



Усе пліты, што выпускаюцца нашай прамысловасцю, разлічаны на ўжыванне метану, а не звадкаванага прапану, які прадаецца ў балонах. Прапан — гэта прадукт нафты, і яго ўласцівасці значна адрозніваюцца ад характарыстык прыроднага газу. Ціск прапану (300 мм ртутнага слупка) удвая вышэйшы, чым у метану (140 мм). Пры гэтым каларыйнасць прапану ўдвая больш, чым у прыроднага газу. Пры згаранні аднаго м³ прыроднага газу выдзяляецца прыкладна 10 тысяч ккал, а пры спальванні прапану — 22—28 тысяч. Менавіта таму газам з балона ваду можна закіпяціць удвая хутчэй, чым прыродным:

— Людзі не ведаюць, што трэба мадэрнізаваць пліту і адаптаваць яе абсталяванне пад ужыванне прапану, а не метану. Зрабіць гэта проста: дастаткова дастаць з канфорак жыклёры і паставіць на іх месца танчэйшыя, з удвая меншым дыяметрам, — раіць Віталь Хлапянюк. — Аднак амаль ніхто гэтага не робіць, і полымя працягвае гарэць пры жыклёрах з шырокім дыяметрам. У выніку мы бачым жоўтыя язычкі агню, якія пры нармальным гарэнні павінны быць блакітнымі. Такім чынам не толькі псуюцца каструлі, якія хутка чарнеюць, а яшчэ і расходуецца на трэць больш газу, чым трэба. Прычым гэтыя 30 % газу не згараюць, а выходзяць у памяшканне чадным газам. Атрымліваецца, што людзі не толькі выпальваюць з памяшкання кісларод, а яшчэ і напаўняюць яго ўзамен паветра чадам, і смерць можа наступіць яшчэ хутчэй.

Застаецца толькі дадаць: паглядзіце на колер агню на сваёй пліце і паклапаціцеся, каб ён быў правільны — блакітны. Ды замест небяспечнай газавай цеплыні выбірайце лепш хай сабе і ў прахалодзе, але жыццё.

**Ірына СІДАРОК**

Сямейная газета
Выпуск № 4 (95)



## ПАВЕТРАНЫ ШАР

У суботу мае сябры пабраліся шлюбам. Прапанову сваёй каханай Алесь рабіў над Дзвіной. Яны былі першыя, хто ўзняўся на паветраным шары над Віцебскам.

Пасля вянчання маладыя паехалі фатаграфавацца. Для гасцей жа замовілі вялікі аўтобус, на якім мы павінны былі дабрацца да рэстарана. Усю дарогу я пазірала ў акно. Раптам маю ўвагу прыцягнуў рознакаляровы паветраны шар. Як высветлілася, гэта Алесь з Юляй падрыхтавалі для нас такі незвычайны сюрпрыз. Усе госці змаглі ўзняцца на тым шары на вышыню сямiпавярховага дома. «Для нас гэты дзень незвычайны, — казалі потым маладыя, — і нам захацелася зрабіць яго незвычайным і для сваіх блізкіх».

14 лютага я паехала на Камароўку, каб купіць мужу ў падарунак арэхі. У пераходзе сустрэла з дзясятак прадаўцоў аднолькавых цюльпанаў, чырвоных шарыкаў у форме сэрцайкаў ды плюшавых мішак. І ўявіла, як тысячы дзяўчат горада атрымаюць вось такія прадказальныя «сюрпрызы»...

На днях сяброўка расказала гісторыю пра трох сваіх прэтэндэнтаў на руку і сэрца. Адзін з іх патэлефанаваў у Дзень закаханых і быццам бы ў сваё апраўданне сказаў, што не прызнае гэтага свята. І віншаваць нікога не збіраецца. Другі прынёс вялізныя завушніцы з каштоўнымі камянямі. «Паглядзі на мяне, — дзяўчына паказвае свае сціплыя сярэбраныя «цвічкі», — я ж такія пафасныя ўпрыгажэнні не нашу». Затое трэці падарыў квіткі ў тэатр оперы і балета — якраз на пастаноўку, якой сяброўка трызніла апошнім часам.

Вы скажаце, галоўнае ж не сам падарунак, а знак увагі. Але, як па мне, гэты знак павінен быць індывідуальны. Пагадзіцеся, нашмат прыемней атрымаць падарунак, які рыхтаваўся з думкамі менавіта пра ЦЯБЕ!

Што датычыцца вяселля, то магу падказаць некалькі арыгінальных ідэй. Сваёй сяброўцы і яе абранніку мы з дзяўчатамі ў свой час падарылі 32 кілаграмы солі, якую змясцілі ў ільняны мех, пашыты ўласноручна. Маўляў, каб спазнаць адно аднаго трэба не адзін пуд солі з'есці. Прыяцелька распавядала, што яе тата напярэдадні вяселля Максіма і Ксеніі Мірных замовіў у бондара вялізную драўляную бочку і напоўніў яе мёдам. Падарыў з пажаданнем, каб «мядовы месяц» ніколі не заканчваўся. Нам з мужам сябры прэзентавалі самаробных лялечак-неразлучнікаў, звязаных паміж сабой адной ніткай. Як сімвал трывалага шлюбу, каб муж і жонка падтрымлівалі адно аднаго па жыцці. Мы ж сваім віцебскім сябрам у ліку іншага падарылі на вяселле сертыфікат на фотасесію ў Строчыцах у нацыянальным убранні. А таксама дзве беларускамоўныя кнігі — «Скрозь люстэрка, і што ўбачыла там Аліса» (на дзяўчынку) ды «Пітэра Пэна» (на хлопчыка) з іменнымі аўтографамі перакладчыкаў. Уручылі з пажаданнем, «каб буслікі вам у хатку кожны год прыносілі па немаўлятку».

Што датычыцца дзетак, то галоўны падарунак, які яны могуць атрымаць ад бацькоў (акрамя жыцця, вядома), — гэта далёка не матэрыяльныя рэчы...

...Аднойчы маленькі хлопчык заблукаў. Ён доўга шукаў дарогу дадому, але так і не змог выбрацца з лесу. І раптам убачыў дзядка з сівой барадой. Хлопчык узрадаваўся і кінуўся да яго: «Мне так страшна тут! А яшчэ я вельмі хачу есці. Дапамажы мне». Стары паглядзеў на малога і моўчкі пайшоў далей сваёй дарогай. Хлопчык пабег за ім, паўтараючы: «Я хачу есці...» Але дзядуля, здаецца, яго не чуў... Праз некаторы час стары пачаў збіраць ягады і падымаць з долу арэхі. Малы стаў паўтараць за ім. Дзядуля добра ведаў, як выжыць у глухім лесе, і хлопчык шмат чаму навучыўся ў яго. У прыватнасці, здабываць сабе ежу, будаваць жыллё... Стары навучыў яго гэтаму, замест таго, каб узяць адказнасць за дзіця на сябе.

Недарэмна мудрыя людзі кажуць: «Калі ты хочаш дапамагчы чалавеку, то прапануй яму не рыбку, а вуду. Хай ён сам яе зловіць...»

**Надзея ДРЫНДРОЖЫК.**

■ Тыя, хто побач

# Іван КІРЧУК: «Я 14 гадоў жыў адзін і больш не планаваў ніякай сям'і»



Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**«Вой, Іван Іванавіч, а дзе ваша барада?» Само сабой вырвалася ў мяне гэтае пытанне, калі адчыніла дзверы ў этналабараторыю і ўбачыла лідара гурта «Этна-трыа «Троіца».**

— У мяне ж маленькія дзеці. Агнешцы — 1,5 года, Стэфану — 3,5. Гуляючы, павыдзіралі ўсю *(смяецца)*. Таму і вырашыў пакінуць маленькую, зараз мне так зручней. Барада ж не зубы, адрасце.

**— Для вас барада мае нейкае сакральнае значэнне?**

— Так, гэта сувязь з родам. Чым даўжэйшая барада, тым, лічыцца, глыбей ты дакранаўся да продкаў. Усё передаецца праз пакаленне. Мой дзед насіў доўгую бараду. А тата не любіў, пастаянна галіўся. Дзяды выраблялі музычныя інструменты — скрыпкі, акардэоны. А тата быў інжынерам. Цяпер я працягваю справу дзядоў, мне гэта на раду было напісана. Мае ж дзеці наўрад ці будуць займацца музыкай, колькі б я іх ні прымушаў. А вось унукі могуць быць добрымі музыкамі.

*(Заканчэнне на 5-й стар. «СГ».)*

■ Вуснамі дзіцяці

# У ГОСЦІ ДА БЕЛАРУСАЧКІ

### Васьмігадовая мадэль са Жлобіна любіць катацца на цягніку. А ў вольны час лепіць з бабуляй калдуны

**Кажуць, таленавіты чалавек таленавіты ва ўсім. Другакласніца Сафія ТРОЦКАЯ, пераможца нашага конкурсу «Беларусікі», умее рабіць нататнікі сваімі рукамі, круціць сабачак і пчолак з шарыкаў, ляпіць калдуны. Але галоўнае яе хобі — быць мадэллю. Дзяўчынка наведвае мадэльную студыю ў родным Жлобіне і ў свае восем гадоў тройчы ўдзельнічала ў паказах Беларускага тыдня моды. Мы завіталі да будучай зоркі ў госці і даведаліся, якая ў яе любімая страва, чаму ёй падабаецца ўдзельнічаць у паказах (паверце, справа зусім не ў прыгожым адзенні) і навошта трэба вучыцца ў школе.**

*(Заканчэнне на 4-й стар. «СГ».)*



Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.

**У Соніным партфоліа — каля сотні фатаграфій.**

■ Кранальная рэліквія

Карэспандэнт «Звязды» разам з матулямі чытала запіскі з раддома

# «ДЗЯКУЙ ЗА СЫНА!»


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**«Шчочкі ружовыя. Носік маленькі, як у мяне. Лобік беленькі, губкі пухлявыя. Яна ўвесь час спіць. Соня — уся ў бацьку». Так Наталля Кароткая апісвае ў лісце мужу дачушку, якая толькі-толькі з'явілася на свет. Яшчэ некалькі дзесяцігоддзяў назад, калі не існавала мабільных тэлефонаў, такія запіскі былі адзінай магчымасцю парадзіхі трымаць сувязь з роднымі.**

### «Учора купіў ванначку, белую, пластмасавую...»

Разам з фотаздымкамі Наталля дастае беражліва схаваны ў канверт паперы. Парыжэлыя ад часу запіскі — успаміны пра нараджэнне яе дзяцей. Жанчына захавала невялікую (у яе дзве дачкі) калекцыю лістоў.


Наталля КАРОТКАЯ з дачкой Вольгай, 1987 год.

— Радзільныя дамы былых часоў можна параўнаць з рэжымнымі аб'ектамі. Сустрэцца з парадзіхамі без дазволу было немагчыма. Гэта і зразумела, здароўе і спакой маладых матуль і немаўлят — на першым плане. Сваю старэйшую дачку Вольгу я нарадзіла ў 1986 годзе. У той час нават стацыянарныя тэлефоны былі не ў кожным доме, не кажучы ўжо пра мабільныя. Адзінай магчымасцю кантактаваць з роднымі былі запіскі. Звычайна ў прыёмныя гадзіны (гэта значыць з 5 да 8 вечара) у палату прыходзіла жанчына, адказная за перадачы, і раздавала пакеты ад родных і запіскі. Мы чыталі, давалі адказы. Блізкія цікавіліся адчуваннем маладой матулі, пыталіся, на каго падобнае немаўлятка, што трэба купіць, расказвалі сямейныя навіны. Раней бацькі не ведалі, хто народзіцца, — хлопчык або дзяўчынка. Часта здагадваліся па народных прыкметах. Калі жанчына змянялася з твару, — значыць будзе дзяўчынка. Нават не з-за пав'яр'яў, а з практычнага боку загадзя нічога не куплялі. Таму пасля родаў у майго мужа была важная задача — падрыхтавацца да выпіскі. «Наташачка, прывітанне! У нас усё добра. Учора купіў ванначку белую, пластмасавую. Камплект для дачкі і аптэчку. Сёння паеду куплю коўдрачку ватную — учора нагледзеў. Ну, што яшчэ трэба? Напішы», — зачытвае Наталля з ліста.

Захавала жанчына не толькі запіскі, але і біркі, якімі пазначалі немаўлят. На іх напісаны рост, вага, пол, дата, час нараджэння дзіцяці і прозвішча маці. Вялікую бірку вешалі на шыйку нараджанага. Маленькія — на ручку і ножку. Так пазначалі дзяцей, каб не пераблытаць.

— Але лісты не былі адзінай сувяззю. Можна было тэлефанаваць на пост. Успамінаю, як мой муж пазваніў медыкам: «Хто нарадзіўся?» На яго пытанне, чаму дзяўчына, а не хлопчык, медсёстры адказалі: «За сынам прыйдзеце наступны раз». Але і іншы раз мары пра сына не здзейсніліся, — смяецца Наталля.

У адказныя моманты можна было карыстацца тэлефонам і парадзіхам.

— Сваю малодшую дачку я нарадзіла першага верасня, якраз у той дзень мая старэйшая пайшла ў школу. Як не пацікавіцца пра такую важную падзею?! — успамінае Наталля. Разглядаю іншыя лісты. На некаторых прыпіска: «Чакаю каля акенца». Пытаю, што гэта значыць.

— Раней дзяцей матулям прыносілі толькі на кармленне. Калі супадала так, што хтосьці з родных прыехаў у гэты час, можна было ў акенца паказаць немаўлятка. І я трымала маленькі кулёк. Але ці можна было разглядзець, на каго падобна дзіця, калі мы знаходзіліся на трэцім паверсе? — дзеліцца жанчына.

Калі Наталля стала бабуляй, сваю ўнучку яна ўпершыню убачыла не праз акно, а атрымаўшы фотаздымак на тэлефон.

— У часы настальгіі я перачытваю гэтыя лісты, успамінаю, паказваю сваім дачушкам. З гэтымі пажоўклымі ад часу запіскамі звязаныя самыя галоўныя падзеі ў маім жыцці — моманты, калі яны з'явіліся на свет.

### «А што такое падгузкі?..»

Сваёй гісторыяй падзялілася і Таццяна Панькова. Сын Юрый нарадзіўся ў далёкім 1977 годзе. Тады сродкі сувязі ўвогуле былі абмежаваныя. Лісты практычна не мелі альтэрнатыў.

— Вось гэта мая самая любімая запіска: «Танечка, мілая!!! Дзякуй за сына!!! Ты ведаеш, як я рады. Калі званіў, дык у мяне трубка дрыжала ў руках. А пачуў адказ: «Таццяна Сяргееўна нарадзіла вам сына. Вага — 3400 г, рост — 50 см». Цалую дзясяць раз. Шчаслівы бацька Міша», — зачытвае запіску мужа жанчына.

Муж Таццяны быў вайскоўцам, шмат часу праводзіў на рабоце. Але кожны дзень, пакуль жонка была ў бальніцы, прыбягаў да яе і пакідаў запіскі.

— Аднойчы мы, парадзіхі, сядзелі ў пакоі. Тут каменьчык стукнуўся аб шыбу. Дзяўчына, ложак якой быў бліжэй да акна, выглянула і кажа: «Таня, гэта да цябе». Гляджу — у плашч-палатцы пад праліўным дажджом стаіць мой Міша. Прасіць, каб я паказала сына ў акно.

Успамінаю, як нам прыносілі дзяцей на кармленне. На адной руцэ медсястры ўмяшчалася трое немаўлят. Так іх шчыльна спавівалі, што, здаецца, пастаў каля сцяны — будуць стаяць, — успамінае Таццяна.

Жанчына прызнаецца, што была вельмі капрызнай парадзіхай. Цытуе словы са свайго ліста мужу: «Ты ўчора дарэчы прынёс шакаладку. Я яе ўжо з'ела... Ляжала і думала, толькі б ты здагадаўся прынесці. Раніцай быў суп з маннай крупы, як баланда. Замест тварагу прынясі сырочкі. Я іх больш люблю».

Таццяна, калі нарадзіла сына, была яшчэ студэнткай БДУ. Таму муж употай, акрамя шакаладу, перадаваў жонцы і канспекты для падрыхтоўкі да экзаменаў. А яшчэ ён нават паспяваў трымаць Таццяну ў курсе спартыўных навін: «Учора глядзеў хакей. Нашы не змаглі абыграць шведаў, нават нічыёй не дабіліся. Прайгралі 1:3. У выніку трэцяе месца. Канадцы зрабілі ўсіх. Яны абыгралі чэхаў 8:2».

— Вельмі часта я давала парады ў запісках. Трэба было купіць пустышкі, бутэлечкі для кармлення. Нават тлумачыла, якую сукенку і туфлі прынесці для выпіскі. А яшчэ на першым паверсе вісеў спіс рэчаў, неабходных для немаўлят. Я сказала мужу знайсці ўсё, што там пералічана. Пасля гэтага атрымліваю запіску: «Што такое падгузкі?»

Запіскі жанчына беражліва захоўвае ў сямейным архіве ўжо больш за 40 гадоў. Кажа: «Вельмі хацелася зберагчы цёплыя словы, віншаванні, каб праз гады паказаць іх сваім дзецям — гэта ж гісторыя нашай сям'і».

**Марыя ДАДАЛКА.**


Таццяна ПАНЬКОВА з мужам Міхаілам і сынам Юрыем, 1977 год.

Сямейная пошта

# МЫ ВЫБІРАЕМ...

## Расплата за ману

**Кавалераў у Надзі хапала, але ўсе былі нейкія «не тыя»: то знешне ён не падабаліся, то па характарах... Карацей, пазнаёміцца з хлопцам, месяц-другі на спатканні паходзіць і ўсё: гэты — бывай. Яна шукае новага...**

Аднойчы ёй вельмі пашчасціла, бо знайшла аж двух: з абодвума час ад часу сустракалася, і абодва ёй падабаліся — нават не ведала, каторы ж больш?

Андрэй (так звалі першага) быў невысокі, чарнявы, з твару не сказаць каб прыгожы, але ж вясёлы, добры. Ва ўсякім разе перад Надзяй ён лістам слаўся, здавалася — гатовы для яе на ўсё!

Неяк раз у садок дзіцячы зайшоў (яна выхавацелькай працавала), чарговы раз падзівіўся, колькі там розных кветак, і раптам спытаў, ці магла б яна сабраць букет і назаўтра ўвечары да яго зайсціся?

«А чаму б і не, — падумала Надзя, нават не здзівіўшыся. — Мне ж па дарозе».

Назаўтра з раніцы (каб кветкі даўжэй пастаялі) яна ўжо рэзала кветкі, а пасля працы ішла да Андрэя (жылі яны ў адным заводскім інтэрнацэ). Затрымлівацца там намеру не мела: хацела аддаць букет (ну ці мала на што патрэбен?) і адразу ж пайсці дадому.

Але хлопец адчыніў перад ёю дзверы, і Надзя застыла на парозе: пасярэдзіне пакоя быў па-святочнаму накрыты стол, за ім сядзелі сябры Андрэя — адзначалі яго... дзень народзінаў!

Хлопец, выходзіць, хацеў, каб Надзя прыйшла, каб павіншавала, хацеў, каб яго сябры ўбачылі яе, пазнаёміліся з абранніцай.

І гэты нумар яму ўдаўся!

Ва ўсякім разе дзяўчына бачыла: ён чакаў яе, быў ашалела рады — усадзіў за стол, стаў накладваць на талерку найсмачнейшыя стравы, жартаваў... (Надзя потым вельмі часта ўспамінала тое гасцяванне, той клопат, увагу...)

Аднак тады яна, можна сказаць, не заўважыла яе: з паўгадзінкі хіба пасядзела ў кампаніі і стала развітвацца — збіралася дамоў.

...Назаўтра, як і ў іншыя дні, Андрэй то праводзіў яе на работу, то сустракаў адтуль, то клікаў некуды схадзіць. У дадатак да гэтых досыць настойлівых заляцанняў Надзю сталі даймаць супрацоўніцы: казаць, што з гэтага хлопца атрымаецца найлепшы муж, што за ім нехта зажыве як за каменнай сцяной...

Надзі казалі, каб яна, крый бог, не была дурніцай, каб не ўпусціла гэтага хлопца, каб, калі кліча, выходзіла замуж...

Што яна? Ды толькі адмахвалася: маўляў, падумаеш Андрэй — свет клінам на ім не сышоўся: іншыя хлопцы таксама ёсць. А каб жанчыны са сваімі парадамі болей не чапляліся, не назалялі ёй, яшчэ і прыдумала, што Андрэй — заядлы «выпівоха», што ў выхадныя п'е не прасыхае...

Абылгала хлопца і сама, здаецца, у тое паверыла: адмовілася з ім сустракацца, аддала перавагу іншаму.

Той — у адрозненне ад Андрэя — быў высокі, бялявы, прыгожы і такі настойліва-смелы, што дзяўчына не тое што разгледзецца ды разабрацца (што ж за чалавек?) — нават азірнуцца не паспела — апынулася замужам.

Як жыла і жыве?

Ды ніяк, бо гэта па вялікім рахунку і не жыццё зусім, а суцэльная пакута. Муж амаль штодня прыходзіць п'яны, вечна шукае да чаго прычапіцца, пачынае сварку і...

Не раз ужо ён падымаў руку — на жонку, на дзяцей, і не дапамагалі тады ні пагрозы, ні слёзы.

Адзінае... Надзя, чарговы раз наплакаўшыся, зноў і зноў успамінае, як аднойчы з вялікім прыгожым букетам прыйшла да Андрэя, як ён быў рады ёй і як жа ўдзячны! За што? За кветкі...

А калі б за яго яна выйшла замуж, калі б яму нарадзіла дзяцей...

Яна сама зрабіла свой выбар. І тым самым абумовіла лёс.

**Таццяна ЧЭКЕД**, *г. Гомель.*

# ВАНДРОЎКА Ў БЕНІЦУ

**Назва артыкула не прыдумвалася аўтаркай у доўгіх творчых пакутах, а была ў адно імгненне пазычана ў Ігната Ходзькі. Такі загаловак мае замалёўка ў яго дасціпных «Запісках квестара».**



Беніцкі касцёл Святой Тройцы — помнік архітэктуры самага пачатку XVIII стагоддзя, які быў пабудаваны ў 1701—1704 гадах.

НАЧЫТАЎШЫСЯ аднаго разу пад вечар ходзькаўскіх гісторыек пра Беніцкі касцёл Святой Тройцы і нябожчыка Коцела, мы, ноч пад уражаннямі не спаўшы, рушылі наступным жа ранкам у тую самую Беніцу, тым самым Віленскім трактам...

... з той толькі розніцай, што герой Ходзькі ішоў пешкі і з Вільні, а мы ехалі на колах і з Мінска. Значыць, рухаліся насустрач, хоць і праз дзвесце гадоў.

Герой Ходзькі, папярэджаны пра марадзёраў-французаў, якіх у яго часе дастаткова, бадзёрыць сябе: «Кій у руку ўзяў і з імем Божым пацёху, per pedes Apostolorum, слядамі Апосталаў, марш!» Мы таксама сябе бадзёрым, але з іншай прычыны. Усё з-за вячэрніх чытанняў, з-за той замалёўкі, у якой пан пісар распавёў пану квестару «цікавую рэч». Быццам касцёл гэты, Беніцкі, пабудаваны на месцы, дзе раптоўна спыніліся коні, перад тым моцна нечым спалоханыя. У калясцы, запрэжанай гэтымі коньмі, ехаў аднекуль у сваё Маладзечна Міхал Казімір Каце́л (гэтак, прынамсі, у Ходзькі, хоць Ко́цел — таксама правільна). Калі ў шалёным лёце спалоханых коней лопнулі цуглі, а фурман зваліўся з козлаў, Катла (ці Коцела) апанаваў жах. Не маючы ўжо надзеі на ратаванне, ён ліхаманкава паабяцаў Богу, што на тым месцы, дзе спыняцца коні, узвядзе касцёл. Як толькі даў такое абяцанне, коні быццам нечаю моцнай рукой былі спынены.

Пан Коцел касцёл узвёў. Вось ён, помнік архітэктуры самага пачатку XVIII стагоддзя, — стаіць, на замок замкнёны, на дзвярах мае шыльду аб тым, што ахоўваецца дзяржавай. Блакітна-зялёныя купалы небу радуюцца: тут гучаць нябесныя арганы. Свае ж арганы Троіцкі касцёл у Беніцы даўно страціў, і сцены яго, непрыступныя знешне, такія насамрэч безабаронныя... Але што пан Коцел? Пражыўшы яшчэ доўгія гады, збудаваўшы вакол касцёла кляштар і аддаўшы першы і другі бернардзіну, ён, калі ўжо зазбіраўся ў шлях незваротны, загадаў намаляваць сябе ў поўны рост, побач столік, пад столікам куфэрак адчынены, а ў ім торбачкі з пазнакамі, колькі ў якой грошай. Партрэт вісеў над ложкам пана Коцела да самага канца яго жыцця, а пад галавою ўвесь час ляжала распараджэнне: як пан Коцел памрэ, партрэт перанесці ў касцёл і павесіць над склепам. Пазначаныя на торбачках сумы схаваць у магіле. Узяць іх адтуль можна толькі на ўзнаўленне касцёла, калі з ім, барані Божа, што здарыцца. Пан Коцел, лежачы ў магіле, сам, маўляў, будзе ахоўваць грошы ад хіжых памкненняў.



Так было яшчэ ў 1930-х.

МЯРКУЮЧЫ па тым, які выгляд мае касцёл Святой Тройцы сёння, як зруйнавана прастора пад блакітна-зялёнымі купаламі, за непрыступнымі знешне сценамі, той выпадак, на які пакідаў грошы пан Коцел, даўно надышоў. Але ж хіба дзе абыдзецца без хіжых памкненняў? Грошы спрабавалі забраць раней. Пан Коцел тады яшчэ абараняў іх. Згодна з аповедам пана пісара, прызначаным для вушэй пана квестара, героя Ігната Ходзькі, аднаго разу згарэў на беніцкім кляштары дах. На кляштары, не на касцёле. Але ксёндз палічыў, што і на такі рамонт можна з магілы фундатара трошкі ўзяць. Айцы і браты бернардзінцы, некалькі чалавек, цёмнай ноччу, каб ніхто не быў сведкам, пры зачыненых касцельных дзвярах, з адной лямпай, памаліўшыся і акрапіўшы магілу, пачалі яе раскрываць. Вядома, у іх па скуры пабеглі мурашкі. (Такія самыя мурашкі бегалі, напэўна, і па нашых сучасніках, якія прымалі касцёл у Беніцы за аб'ект сваіх экстрэмальных прыгод, ледзь толькі даведаўшыся, што антураж яго сутарэнняў нічым не горшы за антураж уражвальных экшнаў накшталт «Лары Крофт» або «Муміі»: раскіданыя там і сям надмагільныя пліты, падпісаныя лацініцай, рэшткі чалавечых касцей, чарапы... Тое, што засталося ад разрабаваных магіл прадстаўнікоў родаў Коцелаў і пароднены з імі Швыкоўскіх... Тое, што засталося ад іх саміх... Быццам так і хочацца тым, хто выкладае жахлівыя фотасправаздачы з наведвання Беніцы ва ўсёдаступны шматцярплівы інтэрнэт, каб некалі і іх рэшткі разам з рэшткамі іх дзяцей і ўнукаў сталі вось такімі рэквізітамі для казытання чыіх-небудзь нерваў. А ўсё, спадарства, старыя паданні.)

Вы, канешне, спытаеце, што было далей з магілай Коцела і бернардзінцамі. Ксёндз пакрапіў пліту, ужо прыўзнятую над магілай, перш чым пад яе зазірнуць. Але ў гэты момант лямпа выпала з рукі таго, хто трымаў яе, і са звонам разбілася, магільная пліта ўпала на месца, і трэск аглушыў айцоў і братоў ордэна. Упалі яны, як непрытомныя, але кожны пасля ўспамінаў, як над вухам пранеслася шэптам сказанае: «Requiescat in pace!» Гэта пан Міхал Казімір Коцел сам над сабою прамовіў зычэнне ляжаць далей у магіле ў вечным спакоі. Не атрымалася...

Ходзькаўскія «Запіскі квестара» з серыі «Ліцвінскіх малюнкаў», у якіх захавана «памяць пра звычаі і цноты збяднелай шляхты», названы «крыніцай сапраўднага скарбу, незаўважанага і занядбанага». У той дзень у Беніцы мы дакрануліся да менавіта такога сапраўднага скарбу — незаўважанага (неацэненага) і сапраўды занядбанага.

НА колішняй карце Ашмянскага павета Беніца пазначана як буйны населены пункт. Недзе тут і стаяў некалі па-старасвецку прыгожы сядзібны дом, увасоблены на малюнку Орды. У ім размяшчаліся бібліятэка, архіў і мастацкая галерэя. Вялікія «сенцы» вялі ў залу з паўкалонамі, а ўправа і ўлева ішлі пакоі з высокімі столямі і печамі «на ножках». У правым крыле размяшчаўся «мемарыяльны» пакой: тут начаваў Напалеон. Ён прыбыў у Беніцу з Маладзечна 22 лістапада 1812-га, а пятнаццатай гадзіне, каб назаўтра а восьмай рушыць далей, на Смаргонь. Світа перамаможнага імператара, начуючы ў процілеглым крыле, пакінула на дзвярах спальні свае прозвішчы. Пасля тыя дзверы пафарбавалі, а пазней замянілі на новыя. Так піша Чэслаў Янкоўскі, чыю кнігу «Павет Ашмянскі», выдадзеную ў 1896 годзе, варта чытаць перад падарожжамі па гэтай цікавай зямлі не толькі таму, што яе мінулае паўстае перад вачыма абсалютна рэальнымі вобразамі, але і таму, што прачытаныя радкі, пранізваючы наскрозь і розум, і сэрца, гэтую былую рэальнасць, не шкодзячы ёй, рамантызуюць.

**Падарожнічала Святлана ВОЦІНАВА.**

## Рамантыкам

Герой Ігната Ходзькі, будучы беніцкі квестар, ішоў, як чытач памятае, з Вільні. Значыцца, трымаўся Віленскага шляху. А па ім хто толькі не праходзіў і не праязджаў. Спіс тых вядомых і слаўных, чые ногі краналіся знакамітай дарогі Мінск—Вільня, дадзены на ўсталяваным у 1979 годзе помніку, на які, едучы ў Беніцу з Мінскага боку, нельга не глянуць. Спыніцеся, спадарства, як убачыце ўказальнік «Мясата». Вёска Мясата размешчана трошкі ўбок ад дарогі, а пры самай дарозе — чатыры вялікія камяні, на іх шыльды, на шыльдах — карта і шматлікія прозвішчы. Ці ўразіць вас тое, што гэтым вось шляхам перамяшчаліся нейк па нашым свеце Сымон Будны, Дзяніс Давыдаў, Тарас Шаўчэнка, Мікалай Гогаль, Язэп Драздовіч, Кастусь Каліноўскі, Тамаш Зан, Францішак Багушэвіч, Уладзіслаў Сыракомля? Апошнія трое дакладна бывалі ў Беніцы. Акрамя іх, там бывалі і Габрыэла Пузыня, і Напалеон Орда, і шмат хто з Агінскіх: дачка Міхала Казіміра Коцела Разалія пайшла замуж за некага з іх. Дарэчы, бываў тут і Міхал Клеафас, аўтар «Развітання з Радзімай». Яго сядзіба Залессе, узведзеная ў 1802—1815 гадах, ад Беніцы зусім блізка.

## Паслядоўнікам

Наш квестар, ідучы з Вільні ў Беніцу, праходзіў праз вёску Меднікі. Да яе ад Беніцы больш за семдзесят кіламетраў, і нашмат цікавейшымі для любога сучаснага нам вандроўніка будуць больш блізкія і легендарныя Крэва, Бянюны, Гальшаны і Баруны. Адлегласці да іх ад Беніцы складаюць адпаведна 21, 45, 47 і 36 кіламетраў, і лёгка іх можна ўключыць разам з Беніцай у аднадзённы шыкоўны маршрут. Меднікі ж, хоць і маюць нейкую сядзібку канца XIX стагоддзя (нічога асабліва каштоўнага), цікавыя нам завочна — тым, як пра іх згадваў квестар, апынуўшыся там пасля Напалеонавага нашэсця. «У Medніках пуста. Двор, вёска, карчма, плябанія без вокнаў; касцёл ачышчаны і спустошаны; нават склепы адчынены і трупы вывернуты». Літаральна як у Беніцы, але ў наш час.

## ДАЛЁКА І БЛІЗКА

2—4 сакавіка, Вільнюс, Кафедральная плошча і вуліцы Старога горада. У гэты час тут пройдзе знакаміты і старадаўні (ажно ад XVII стагоддзя вядзе гісторыю) кірмаш Казюкаса. Прысвечаны вясне і святому Казіміру, ён прапануе сваім наведвальнікам разнастайныя вырабы ўмельцаў-рамеснікаў. Абавязковыя набыткі — літоўскія абаранкі і пернік «Сэрца Казюкаса».



**На Савецкай плошчы і Савецкай вуліцы ў Гродне 4 сакавіка пройдзе свята рамеснікаў «Казюкі». Гродзенцы і турысты змогуць набыць сабе па прыемных цэнах вырабы з металу і скуры, дрэва і пластыку, бісеру і іншых матэрыялаў у арыгінальных аўтарскіх тэхніках.**

У Гомельскім палацы Румянцавых і Паскевічаў праходзіць выстаўка пад назвай «+1500». Яна прадстаўляе новыя паступленні ў музей — рэчы самага рознага кшталту: манеты, знаходкі археолагаў і палеантолагаў, кнігі, дакументы, паштоўкі, маркі, мэблю, карціны... Варта паглядзець на тое новае старое, што збіраецца заняць месца ў залах палаца.



**2—4 сакавіка ў Брусэлі — Salon du Chocolat, фестываль бельгійскага шакаладу — свята для тых, хто ведае, які шакалад варта лічыць сапраўдным. Гэта не проста гандаль смакатой, няхай сабе нават скульптурнай, і не толькі традыцыйны паказ калекцый шакаладнага адзення. Гэта яшчэ і семінары ды майстар-класы, якія, несумненна, адлюстроўваюць ісціну пра тое, што чалавеку каштоўнейшая вуда, чым рыба. На гэты фэст трэба ехаць вытворцам.**



10—12 сакавіка ў Фларэнцыі прапануецца зацукраваная мімоза. На старой чыгуначнай станцыі Леапольда, перабудаванай у выставачны цэнтр, пройдзе моднае дэфіле, сумешчанае з гастранамічным фэстам, на якім будуць падавацца самыя смачныя паштэты, самая разнастайная (памерані і колерамі) паста, самыя незвычайныя ідэі з удзелам садавіны, ягад, кветак і цукру. Мімоза — у гэтым спісе.

# У ГОСЦІ ДА БЕЛАРУСАЧКІ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

## Што ў «працоўным» гардэробе?

Соня сустракае нас пры поўным парадзе: у белай кашулі, цёмным сарафане, з падфарбаванымі веікамі і ружовымі вуснамі. Шустрая, непасрэдная, вясёлая. Пакуль мама Святлана накрывае на стол, дзяўчынка прапануе паказаць нам сваё партфоліа. Дастае з паліцы некалькі папак і раскладае на канапе, напэўна, сотню здымкаў.

**— Фатаграфавацца любіш?**

— Люблю. У месяц у мяне бывае па чатыры фотасесіі. Магу паказаць вам выйгрышныя позы *(ускоквае)*. Каб добра атрымацца на здымку, нельга да камеры падэшву выстаўляць і локцем павярочвацца. А калі даўгія валасы, можна заплесці коскі і закруціць іх вакол шыі.

На вешалцы каля акна — Сонiна адзенне для здымак. Сёлета, паколькі праходзіць зімовая Алімпіяда, многія ладзяць фотасесіі на тэму спорту, таму ў «працоўным» гардэробе юнай мадэлі ёсць гімнастычны купальнік і гоначная куртка. Прыгожая сукенка з белых карункаў — падарунак ад дызайнера.

**— Гэта твой пакой?** — пытаемся ў Соні.

— Тут толькі мой куток, — усміхаецца дзяўчынка, ківаючы на пісьмовы стол. — Пад свой пакой я б хацела заняць залу, там шмат месца. Пакleіла б аранжавыя шпалеры (гэта мой любімы колер), паставіла б шафкі для адзення, пavесіла мае фатаграфіі, гадзіннік. І тэлевізар абавязкова, люблю яго глядзець. Не, не мульцікі — камедыйныя серыялы.

У будучай мадэлі ёсць ужо свая старонка ў Інстаграме, але вядзе яе мама. Што рабіць: хочаш, каб запрашалі на паказы, зарабляй папулярнасць. Сям'я ў Соні, дарэчы, самая звычайная. Тата працуе дальнабойшчыкам, мама — медсястрой у дзіцячым санаторыі. Старэйшы брат вучыцца на эканаміста.

— Хадзем на гарбату! — кліча Святлана.

За сталом Соня цягнецца да шакаладных вафляў.

**— Мадэлям салодкае можна?**

— А чаму нельга? — здзіўляецца ў адказ дзяўчынка.

## Прыгожа хадзіць — для дзяўчат не лішняе

**— Даўно ў мадэльнай школе займаешся?**

— З пяці гадоў. Хаджу кожную нядзелю. Заняткі доўжацца дзве з паловай гадзіны. У нас тры прадметы: дэфіле, харэаграфія, а трэці — кожны раз новы. Напрыклад, вучым правілы этыкету, як у розных краінах вітаюцца, складваем калажы з адзення ў пэўным стылі. Макіяж праходзілі — гэта маё самае любімае.


Такіх сабачак з шарыкаў дзяўчынка дорыць сябрам.

— Соня, калі прыйшла, была самай маленькай, — дадае мама. — Узялі з-за высокага росту. Дачка сціплая такая была. Крыўдзілі яе спачатку: і штурхалі, і крыўлялiся. А цяпер Соня з усімі пасябравала.

**— Чаму вырашылі аддаць дачку ў мадэлі?** — пытанне Святлане.

— Я заўсёды любіла модна адзявацца. Мне падабаецца ўсё прыгожае, гламурнае *(смяецца)*. Часопіс «Касмапалітан» з маладосці чытаю. Няма дзе нумары складаць: яны ж цяжкія, паліцы абвальваюць. Таму захоўваю выпускі толькі за апошнія тры гады. Соня любіць праглядаць старыя часопісы моды. Дызайнераў пакуль не запамінае, але выхоўвае густ. Калі ідзем з ёй па горадзе, адзенне мінакоў лёгка можа прааналізаваць: ці спалучаюцца рэчы па колерах, які гэта стыль.

**— Адразу ў дачкі ўсё атрымлівалася?**

— Не, дома часта трэніравалася. Яны ж у мадэльнай школе экзамены два разы на год здаюць. Мне здаецца, Соня там загартавалася. Дый умець прыгожа хадзіць і фарбавацца для любой дзяўчыны, думаю, будзе карысна. Хоць тата казаў, лепш бы на таэквандо аддалі.

**— Соня, калі ў паказах удзельнічаеш, хвалюешся?**

— Не-а.

— Ні грама, — пацвярджае Святлана. — Яна смелая. Гэта ў мяне, калі ў зале сяджу, каленкі трасуцца і далоні становяцца мокрыя.


Сафійка гуляе разам з мамай Святланай у беларускамоўную «настолку», якую атрымала за перамогу ў конкурсе «Беларусікі».

**— Якое б адзенне сама стварала?**

— Што-небудзь летняе. Шорты, топік.

— У адзенні яна зусім не капрызная. І я яе прывучаю да таго, што ў дызайнераў сваё бачанне моды: якую рэч скажуць паказаць на подыуме, у такой і пойдзеш.

**— Падабаецца быць мадэллю?**

— Так. Люблю і паказы, і фотасесіі. Але больш паказы, бо я на іх на цягніку езджу. У дарозе мы з сяброўкай чыпсы ядзім, малюем у вадзяных альбомах. Заліваеш у фламастар ваду, праводзіш ім па старонцы і там праяўляецца ілюстрацыя. Не ведаеце такога? Давайце прынясу пакажу *(выбягае ў іншы пакой і вяртаецца з альбомамі)*.

— Іх потым можна высушыць на батарэі і зноў выкарыстоўваць, — тлумачыць мама. — У дзяцей няяк вады не было з сабой, дык яны кока-колы заліліі ў фламастары. І нічога, не сапсавалі размалёўку.

**— Вялікая канкурэнцыя сярод мадэляў?** — звяртаюся да Святланы.

— У іх узроставай катэгорыі — так. За ўздзел у паказах яшчэ і плаціць трэба. На кастынгах звяртаюць увагу, як дзяўчаты ходзяць, як трымаюць сябе, ці не замкнёныя. Знешнасць цяпер любяць нестандартную. Вядома, калі жывеш у Мінску, працэй — шмат дзе можаш паспець паўдзельнічаць. Хоць Соня ўжо таксама здымалася ў некалькіх рэкламах — для каталога Жлобінскай швейнай фабрыкі, крамы ў нашым горадзе, гандлёвага цэнтра ў Гомелі.

**— Прыгожы чалавек — гэта які?** — цікавімся ў юнай мадэлі. — *(задумваецца.)* Такі, на якога звяртаюць увагу, калі ён ідзе насустрач.


Майстар-клас па пазіраванні.

## Любімыя прадметы — маляванне і АБЖ

**— У школу табе падабаецца хадзіць?**

— Не. У некаторыя дні бывае пяць урокаў, дык я не люблю столькі сядзець, стамляюся. Падабаецца толькі маляванне. Ну, яшчэ матэматыка і АБЖ.

— Яна няўседлівая. Хутка ўсё робіць. Нават заданне з дошкі ўважліва не перапіша, не перапраўверыць, — уздыхае Святлана.

**— Як думаеш, навошта трэба хадзіць на заняткі?**

— Каб атрымліваць новыя веды. Напрыклад, вы заблукалі ў лесе. Што неабходна зрабіць? Крычаць «Агу!», «Ратуйце!», «На дапамогу!». Табліца множання таксама ж спатрэбіцца.

— Цяпер многія дзеці замест казак глядзяць па інтэрнэце скарочаны змест. Мы чытаем цалкам. Калі я не паспяваю, Соня з бабуляй за кніжкай сядзіць. Летам стараемся праходзіць штосьці з праграмы.

**— Да якога казачнага персанажа хацела б быць падобнай?**

— Да прынцэсы Сафіі. Гэта гераіня з набору для творчасці, які мне брат падарыў. Там трэба было ёй пацеркі і бліскаўкі клеіць на сукенку. Чаму Сафія падабаецца? Яна прыгожая, сочыць за модай.

**— Чым любіш пасля ўрокаў займацца?**

— Клеіць, маляваць. Падарункі сваімі рукамі раблю сябрам, нататнікі, напрыклад.

— Мы не паспяваем фарбы купляць! Былі б у Соні грошы, яна ўсё патраціла б на ручкі, фламастары, шкатулачкі. У яе нажніц рыфленых штук сем, напэўна. А вось лялек у дачкі няма, не цікавіцца імі. Любіць настольныя гульні: даміно, нарды — ёй тата самаробныя падарыў.

**— Па доме дапамагаеш?**

— Так, я часта сталы выціраю, посуд мыю. І чайнік стаўлю.

**— Можа і гатаваць ужо ўмееш?**

— Ну, калі толькі бліны. З бабуляй яшчэ калдуны лепім — гэта нялёгка.

**— Бульбу любіш?**

— Я яе абажаю! Асабліва пюрэ. Усё ем з бульбай — мяса па-французску, сасіскі, рыбу.

**— У Мінск не збіраешся пераехаць?**

— Не, тут застануся. У Мінску неяк нязвыкла. Я там шмат куды хадзіла, толькі на коле агляду ніколі не была.

**— А кім хочаш стаць?**

— Мадэллю. Я і так мадэль. Буду хадзіць на паказы, рэпетыцыі, ездзіць па свеце. Хачу ў Парыж — там класна. Абавязкова сфатаграфуюся на фоне Эйфелевай вежы.

**Наталля ЛУБНЕЎСКАЯ.**
**Фота Ганны ЗАНКАВІЧ.**
*г. Жлобін.*



## ■ Конкурс працягваецца!

## ВОЙ, ДЫ НА ЛУЗЕ КВЕТАЧКА

«Маёй дачушцы Яўгеніі пяць гадоў, — піша Вольга Казачэнка. — Яна вельмі любіць сваю радзіму. Наведвае дзіцячы садок № 9 горада Ваўкавыска, у якім праводзяцца дні беларускай мовы. Сёлета дачка прымала ўдзел у пастаноўцы на Каляды. Любіць спяваць, танцаваць. Асабліва добра атрымліваюцца беларускія песні ды вясёлыя танцы. Мне падаецца, што да гэтага здымка вельмі пасуюць вершаваныя радкі Веры Вярбы.

*Мой край — лугі і пералескі,*
*Крыніцы звон і шум лясны,*
*Мой край — блакітныя пралескі*
*На сцежках раннія вясны.*
*Высока ў небе вырай кружыць,*
*Ляціць за сіні небакрай.*
*Не забывай ніколі, дружа,*
*Сваю зямлю, свой родны край».*

***Шаноўныя мамы і таты, бабулі і дзядулі! Шчыра запрашаем вас прыняць удзел у конкурсе «Беларусікі». Дасылайце здымкі вашых дзетак, унукаў, а можа, нават і праўнукаў (з невялічкім аповедам) на адрас «Звязды». Але адна ўмова — каб, зірнуўшы на фота, адразу ж можна было зразумець, што гэта беларусік. Арыгінальнасць і творчы падыход вітаюцца! Аднаго з герояў, якога мы ўбачым на здымках, чакае прыз!***

# «...Жыў адзін і больш не планаваў ніякай сям'і»

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «СГ».)*

***— Познія дзеці, напэўна, аддаляюць старасць?***

— Разумею, што ў свае 59 павінен няньчыць унукаў, а няньчу сваіх дзяцей. Але я ніколі не лічыў сябе старым, нават калі насіў даўжэзную бараду. Аднойчы нехта напісаў ліст «Троіцы». «Вой, добра, што Івану Іванавічу не 85 гадоў. Я думаў, што ён хутка памрэ... А хто ж тады будзе спяваць у «Троіцы»?» На той час мне было гадоў 50 *(смяецца)*. У мяне ёсць і два дарослыя сыны, 31 і 37 гадоў. Калі яны нарадзіліся, я быў яшчэ зусім «зялёны», шмат гастраляваў, мала часу з імі бавіў. Са Стэфанам і Агнешкай усё па-іншаму, гэта ўжо такое свядомае бацькоўства, якім я цешуся.

***— Як бавіце час з дзеткамі?***

— Як усе бацькі. І малюем, і кніжкі чытаем. Са Стэфанам выдумляем розныя гісторыі. У нас гэта вельмі добра атрымліваецца. Пераробліваем на свой лад старыя казкі. Напрыклад, калабок у нас застаецца жывы, яго не з'ядае ліса...

***— Бачыла на вашай старонцы ў Фэйсбуку пляжны здымак, дзе вы несяце Агнію ў слінгу, Стэфана на плячах... Змалку прывучаеце дзетак да вандровак?***

— Летась мы ўсёй сям'ёй ездзілі на мора ў Балгарыю. Тады мы з Кацяй (жонкай. — **Аўт.**) вырашылі дабрацца да магілы Вангі, што ў балгарскім сяле Рупітэ. Гэта быў няблізкі свет, 800 кіламетраў толькі ў адзін бок.

***— Чаму менавіта да Вангі?***

— Нас цікавіла не так Ванга, як тыя мясціны, дзе яна пахаваная. Там вулкан, вельмі моцная энергетыка. На жаль, не так доўга ў тым сяле былі, трэба было да цёмнага вярнуцца ў гатэль, бо дзеці малыя, іх трэба карміць ды ўкладваць спаць. Вырашылі, што абавязкова калі-небудзь яшчэ з'ездзім, каб яшчэ больш прапусціць праз сябе гэтае незвычайнае месца.

## «Жанчыны мне не перашкаджалі. Гэта галоўнае»

***— Сям'я, «Троіца», монаспектаклі, кнігі, выкладанне... Як вы ўсё паспяваеце?***

— Рана прачынаюся. Нават падчас гастроляў з «Троіцай» магу легчы ў дзве гадзіны ночы, але а пятай гадзіне раніцы я ўжо на нагах.

***— Што вы паспелі зрабіць да нашай сустрэчы (завіталі мы ў госці да Івана Кірчука а дзясятай гадзіне раніцы. — Аўт.)?***

— Зараз усе мае думкі з новай кнігай фолк-фэнтэзі «Города восхождений», на якую я збіраю сродкі на краўдфандынгавай платформе. Таму, як толькі прачнуўся, пачаў рассылаць каму толькі мог спасылку, выклаў кавалачак новай главы, каб зацікавіць. Справа рухаецца складана, відаць, сёння шмат людзей збірае такім чынам грошы.

***— Праўда, што гэта Каця натхніла вас на новую кнігу?***

— Так. Тры гады таму я паказаў ёй сваё фантастычнае апавяданне. Яна сказала, каб паспрабаваў сябе ў іншым стылі (да гэтага я пісаў дзённікі). Паспрабаваў і сам не заўважыў, як мяне зацягнула, самі сабой пачалі з'яўляцца новыя персанажы, незвычайныя абрады, загадкавыя рытуалы. У маёй кнізе няма ні змеяў, ні мышэй. Мне хацелася паказаць іншае: што ёсць той Сусвет, дзе мы бываем быццам у сне. І гэты Сусвет дае нам каштоўныя веды.


Фота Сяргея НІКАНОВІЧА.

**«Шмат усяго запісваў у розных краінах, дзе толькі мы з «Троіцай» не былі. Сваё ж нейк збоку было. Думаў, паспею...»**

***— Вы перажылі два разводы. Ці зразумелі, што галоўнае ў сям'і, каб яна была моцная?***

— Нейк у экспедыцыі адна бабулька сказала: «Кожнаму Бог пару дае. А вось колькі каму адведзена быць разам — невядома. Нават на адзін дзень ёсць пара і чалавек шчаслівы». Універсальнага рэцэпта няма. Але важную ролю адыгрывае падмурак, на якім будуецца сям'я. Ёсць такі абрад, калі незамужняя дзяўчына падыходзіць да бярозкі і завязвае стужачкі. Адна — чырвоную, каб было каханне, другая — зялёную, каб было здароўе, а трэцяя — жоўтую, каб былі грошы. Некаторыя пытаюцца, ці можна завязаць некалькі стужачак. Дык вось нельга, трэба выбраць штосьці адно, галоўнае.

***— Кажуць, поспехі мужчыны залежаць ад жанчыны, якая побач. Якую ролю ў тым, чаго вы дасягнулі, адыгралі вашы жонкі?***

— Самае галоўнае, што не перашкаджалі. Я чалавек заняты, з захапленнямі ў мяне заўсёды пад завязку.

***— Наколькі мне вядома, Каця на момант вашага знаёмства была аспіранткай...***

— Так, будзе хутка абараняцца. З нараджэннем дзетак яна прыпыніла працу над дысертацыяй. Мы працавалі разам на былой кафедры этналогіі і фалькларыстыкі. Каця вяла семінары і практычныя заняткі ў студэнтаў і па беларускім фальклоры... Часам ёй прыходзілася падмяняць Кірчука на занятках *(усміхаецца)*.

***— Як ужываюцца два этнографы-фалькларысты ў адной сям'і?***

— У Каці іншы падыход да фальклору. Яна навуковец, а я больш практык. Амаль за 35 гадоў зрабіў шмат рэканструкцый абрадаў і свят. Зноў-такі мы адно аднаму не перашкаджаем. Калі б былі два навукоўцы, не ведаю, як бы гэта было.

***— Чаму спынілі свой выбар менавіта на Каці? Не пужала розніца ва ўзросце ў 28 гадоў?***

— Трэба запытацца недзе там наверсе. 14 гадоў да Каці я жыў зусім адзін, не планаваў больш ніякай сям'і. Не ведаю, як гэта растлумачыць. Асабліва калі ёсць працяг — двое дзяцей. Відаць, гэта трэба космасу, зямлі, людзям... У кожнага свая дарожка...

## «Мама ведала зёлкі ад бясплоддзя»

***— Вы ўжо больш як трыццаць гадоў збіраеце па вёсках фальклор. Падчас аднаго з інтэрв'ю сказалі, што галоўная этнаэкспедыцыя будзе да маці, якая пагадзілася праспяваць вам усе польскія песні, што ведае. Ці адбылася яна?***

— Так, але мамы ўжо няма больш за год. У Дзеда Томаша па мамінай лініі было 14 дзяцей. Калі да нас прыязджалі цёткі ды дзядзькі і спявалі за сталом, вось тады трэба было іх запісваць. Але хто ж думаў, што людзі так мала могуць жыць на свеце?! Калі я ўжо вырашыў гэты запіс зрабіць, то з 14 братоў і сясцёр мне спявалі двое — мая мама і хросная. Яе таксама ўжо няма, на жаль. Праўда, яны больш плакалі, чым спявалі. Заўсёды падчас сваіх лекцый раю пачынаць збіраць фальклор са сваёй сям'і, свайго роду.

Мая мама была вельмі вядомай у Лідзе лекаркай. Яна ведала травы ад бясплоддзя. Сам тройчы бачыў, як на рынак маладзіцы прыносілі сваіх маленькіх дзетак, казалі: «Галіна Цімафееўна, яны нарадзіліся дзякуючы вам». Вельмі шкадую, што не дазнаўся ў мамы пра тыя зёлкі. Шмат усяго запісваў у розных краінах, дзе толькі мы з «Троіцай» не былі. Сваё ж нейк збоку было. Думаў, паспею...

**«Разумею, што ў свае 59 павінен няньчыць унукаў, а няньчу сваіх дзяцей. Але я ніколі не лічыў сябе старым, нават калі насіў даўжэзную бараду.»**

***— Нейк вам задавалі пытанне пра самы шчаслівы дзень у жыцці. Вы адказалі: «Перыяд, калі быў жывы бацька». Можаце пашырыць адказ?***

— Таты няма больш за 10 гадоў. Мне і дагэтуль не хапае размоў з ім. Ён цікавіўся «Троіцай», з задавальненнем глядзеў фотаздымкі з гастроляў, якія я прывозіў. Дарэчы, мая першая экспедыцыя адбылася менавіта дзякуючы бацьку. У 1983 годзе я рабіў абрад «старадаўняе вяселле» і мне спатрэбіліся ручнік і посцілка. Кажу тату: «Давай купім?» — «Нашто купляць? Твае цёткі гэта ўсё робяць», — пачуў у адказ. У выніку мы прывезлі цэлую машыну экспанатаў. Бацька ёсць бацька. Вельмі б хацелася, каб сучасная моладзь гэта разумела, цаніла і шанавала сваіх татаў.

У маленстве бабуля мне расказвала, што першы чалавек нарадзіўся з хвастом. Але Богу гэта не спадабалася, бо звяры таксама з хвастамі ходзяць. Ён наслаў на Адама вельмі моцны сон. І пакуль той спаў, адрэзаў яму хвост ды паклаў побач. З тых часоў і павялося, што муж — галоўны, а жонка — хвосцік. А цяпер у сучасным свеце ўсё наадварот. Ідзе моцная жанчына і такі невялічкі хвосцік побач. Гэта ненармальна. Калі ёсць Бацька ў сям'і — гэта зусім іншая энергетыка.





З дзеткамі каля магілы Вангі.

***— Чаму так важна ведаць свае карані і шанаваць бацькоў?***

— Лепш намалюю *(бярэ аловак і аркуш паперы)*. Гэта лінія — зямля, ці мая маці, а вось гэта лінія — дождж, ці мой бацька. Калі дождж праліўся на зямлю, з'явіўся расток, ці я. Калі ў мяне з бацькамі добрыя адносіны, дык атрымліваю ад іх сілы, здароўе, грошы. Калі я з татам, напрыклад, пасварыўся або няма паразумення з маці, энергетычны канал закрываецца. Я магу страціць працу, развесціся з жонкай, пачаць піць...

***— Пакажыце мне якую-небудзь рэч, дзякуючы якой я змагу даведацца пра вас штосьці новае.***

— *(Паказвае камень у форме пальца.)* Калі я быў малы, знайшоў у сябе ў Лідзе на падворку вялікі валун. І на ім была нейкая літара. Я яго перацягваў з аднаго месца на другое, каб ён прыгожа ляжаў. Прайшло шмат часу, цікавасць да камянёў не страцілася. Куды б ні ехаў з «Троіцай» ці сям'ёй, адусюль цягну цэлы заплечнік цікавых камянёў.

***— Як памежнікі на гэта рэагуюць?***

— Нармальна. Кажу, што гэта рэквізіт для сцэны. Некалькі гадоў таму мама мне падарыла лецішча за 20 кіламетраў ад Ліды. Я там разбіў сад камянёў. Якой толькі формы іх там няма! Сын, як пабачыў тыя камяні, тут жа стаў іх перацягваць з месца на месца. Стэфан — гэта мая копія. Усё, што ён робіць, я рабіў у дзяцінстве.

Дарэчы, з камянямі адбываліся розныя містычныя рэчы. На працягу пяці гадоў я насіў у кішэні крэмень. Аднойчы, падчас майго вяртання з Варшавы на лецішча, ён упаў і разбіўся на пяць кавалкаў. І ў мяне памёр сябра. Нашы продкі з вялікай павагай адносіліся да камянёў, яны верылі, што ўсё гэта жывое.

***— Пра што сёння марыце?***

— Перавезці да юбілею *(У верасні Івану Кірчуку спаўняецца 60 гадоў. — **Аўт.**)* сваю трох'ярусную батлейку з Варшавы на лецішча. І каб у «Троіцы» з'явілася годная рэпетыцыйная кропка. Пакуль мы рэпетуем у Шчомысліцы. У сельскім клубе, дзе пакойчык, напэўна, у разы тры меншы, чым гэтая этналабараторыя.

А яшчэ мы з Кацяй усё часцей размаўляем пра тое, каб пераехаць жыць у вёску. У шматпавярховых дамах нездаровая энергетыка. Там, у кватэры наверсе, будуць сварыцца, недзе ўнізе кватэра наркамана, справа — алкаголікаў. У сувязі з тым што людзі жывуць не так, як іх продкі, узнікаюць пэўныя праблемы, у тым ліку і са здароўем...

Надзея ДРЫНДРОЖЫК.

## ИЗВЕЩЕНИЕ
### ОАО «БЕЛФА» г. ЖЛОБИН ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 29 марта 2018 г. ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ

**ПОВЕСТКА ДНЯ**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2017 год и основных направлениях деятельности Общества на 2018 год.
2. Отчет о работе Наблюдательного совета за 2017 год.
3. О результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2017 год
4. Утверждение годового отчета: бухгалтерского баланса и приложений к нему за 2017 год.
5. Об использовании чистой прибыли, полученной в 2017 году и выплате дивидендов за 2017 год.
6. Утверждение направлений использования прибыли, остающейся в распоряжении предприятия (после уплаты налогов, сборов (пошлин), других обязательных платежей) на 2018 год и первый квартал 2019 года.
7. Избрание членов наблюдательного совета Общества и ревизионной комиссии.
8. О размерах вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.

Собрание состоится в конференц-зале Общества по адресу:
проезд Красный, 2, г. Жлобин, Гомельская область.
Начало в 11.00.
Регистрация участников собрания с 9.00 до 10.45.
Для регистрации при себе иметь следующие документы:
акционеру Общества – паспорт;
представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании, составляется на основании данных реестра владельцев акций по состоянию на 1 марта 2018 года.

С материалами по проведению собрания можно ознакомиться по месту нахождения Общества с 15 марта 2018 года.

Наблюдательный совет.

УНП 400076540

### Открытое акционерное общество «Завод по ремонту и техническому обслуживанию вычислительной техники» (сокращенное наименование: ОАО «Белсчеттехника») сообщает, что очередное общее собрание акционеров состоится 28 марта 2018 г. в 8.00 по адресу: г. Минск, ул. Ф. Скорины, д. 14, ком. 226.

**Повестка дня**

1. Отчет дирекции о деятельности ОАО «Белсчеттехника» в 2017 году и задачах по обеспечению выполнения показателей социально-экономического развития на 2018 год.
2. Заключение ревизионной комиссии о проверке финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белсчеттехника» за 2017 год.
3. Утверждение годового баланса ОАО «Белсчеттехника» за 2017 год.
4. Утверждение размера и порядка выплаты дивидендов за 2017 год.
5. Утверждение направлений использования чистой прибыли в 2018 году.
6. Об определении размера безвозмездной (спонсорской) помощи ОАО «Белсчеттехника» в 2018 году.
7. Об условиях материального вознаграждения членов совета директоров и ревизионной комиссии ОАО «Белсчеттехника».
8. Выборы членов совета директоров и ревизионной комиссии ОАО «Белсчеттехника».

Начало регистрации в день проведения и по месту проведения очередного общего собрания акционеров в 7.30.

С материалами повестки дня очередного общего собрания акционеров можно ознакомиться по адресу: г. Минск, пер. Бехтерева, д. 8, к. 1 (приемная) в течение 7 рабочих дней до проведения собрания с 11.00 до 12.00.

Списки акционеров для регистрации участников очередного общего собрания составляются на 23 февраля 2018 года.

Участникам собрания при себе необходимо иметь документ, удостоверяющий личность (для представителя акционера – доверенность).

Телефон для справок (8 017) 295-23-68.

УНП 100064838

## ОБЪЯВЛЕНИЕ
### Открытое акционерное общество «МЕХКОЛОННА № 93» сообщает, что 28 марта 2018 года в 11.00 состоится очередное годовое общее собрание акционеров

Место проведения собрания: 220024, г. Минск, ул. Бабушкина, 13, кабинет 303.
Форма проведения – очная.

| № п/п | ПОВЕСТКА ДНЯ |
|---|---|
| 1 | Об утверждении годового отчета Общества за 2017 год |
| 2 | Об утверждении годового отчета Наблюдательного Совета за 2017 год |
| 3 | Об утверждении годового отчета Ревизионной комиссии за 2017 год |
| 4 | О рассмотрении заключения ревизионной комиссии Общества за 2017 год, аудиторского заключения за 2017 год |
| 5 | Об утверждении годового бухгалтерского баланса за 2017 год и пояснительной записки к нему, отчета о прибылях и убытках Общества за 2017 год, отчета об изменении капитала Общества за 2017 год, отчета о движении денежных средств Общества за 2017 год |
| 6 | О покрытии убытков по итогам деятельности Общества за 2017 год и о планах распределения прибыли за 2018 год |
| 7 | Об утверждении основных направлений деятельности Общества на 2018 год |
| 8 | Об избрании членов Наблюдательного совета Общества |
| 9 | Об определении размера и порядка выплаты вознаграждения членам Наблюдательного совета в связи с исполнением ими своих обязанностей |
| 10 | Об избрании членов ревизионной комиссии Общества |
| 11 | Об определении размера и порядка выплаты вознаграждения членам Ревизионной комиссии в связи с исполнением ими своих обязанностей |

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по адресу: г. Минск, ул. Бабушкина, 13 (каб. 6), в период с 21 марта 2018 г. по 27 марта 2018 г. по рабочим дням, с 10.00 до 16.00 либо 28 марта 2018 года по месту проведения собрания.

Регистрация участников собрания будет проводиться с 10.00 до 10.50 по месту проведения собрания.

Начало работы собрания – 28 марта 2018 года в 11.00.

Список лиц, имеющих право на участие в собрании акционеров, будет составлен на основании реестра акционеров, сформированного на 23 марта 2018 года.

Для регистрации при себе иметь следующие документы:
– акционеру общества – паспорт;
– представителю акционера – паспорт и доверенность.

Наблюдательный совет.

УНП 100003019

### СОАО «Ферейн» извещает о проведении торгов по продаже объекта недвижимости – производственного здания, расположенного по адресу: Минская обл, Минский р-н, Ждановичский с/с, аг. Ждановичи, ул. Линейная, 1Б

Реализация имущества будет осуществляться на условиях открытого конкурса. Предметом конкурса является право заключения договора купли-продажи указанного имущества. Договор будет заключен с победителем торгов не позднее 5 рабочих дней со дня проведения конкурса. Начальная цена торгов без НДС – 369,500,00 белорусских рублей. Оплата по договору в течение 3 рабочих дней с момента заключения договора купли-продажи.

Проведение предварительного осмотра реализуемого имущества и получение дополнительной информации по согласованию с представителем организатора конкурса.

Конкурс будет проводиться: г. Минск, пер. С. Ковалевской, 52а-28, 26.03.2018 в 11.00. Окончание приема заявок на участие в конкурсе – 22.03.2018 включительно.

К участию в конкурсе допускаются юридические и физические лица, представившие организатору торгов следующие документы: заявление на участие в конкурсе; конкурсное предложение; копию свидетельства о регистрации (для юридических лиц и индивидуальных предпринимателей); копию устава (для юридических лиц); документы, подтверждающие полномочия представителя юридического (физического) лица.

Документы для участия в конкурсе подаются представителю организатора конкурса по адресу: г. Минск, ул. Сурганова, 57Б, оф. 174, в период времени с 10.00 до 18.00 с предварительным согласованием с представителем организатора конкурса.

Представитель организатора конкурса: Севастюк Владимир Александрович, тел. +375 44 555-54-09.

УНП 190209496

